

РОСТ ЦЭН ПАВІНЕН ЗАМАРУДЗІЦЦА

3

ДРЭВА Ў ГОНАР ВАШАЙ СЯМ'І



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЖНІЎНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 149 (29016)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА

## ЛІЧБА ДНЯ

**71 514 асабовых дэпазітных рахункаў**

*адкрыта ў аддзяленнях Беларусбанка па праграме сямейнага капіталу на 1 жніўня — столькі шматдзетных сем'яў скарысталіся такой магчымасцю. На іх рахункі залічана $715,14 млн. У тым ліку сёлета ў студзені—ліпені — 8645 рахункаў на агульную суму $86,45 млн, адзначае Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Праграма дзейнічае з 2015 года. Сямейны капітал прызначаецца ў выглядзе аднаразовай выплаты ў памеры $10 тыс. пры нараджэнні (пасля 1 студзеня 2015 года) трэцяга і наступных дзяцей. У 2015 годзе быў адкрыты 11 581 рахунак ($115,81 млн), у 2016-м — 18 982 ($189,82 млн), у 2017-м — 16 840 ($168,4 млн), летась — 15 466 ($154,66 млн). Праграма завяршаецца 31 снежня 2019 года, але эфектыўнасць гэтай меры стала падставай для падаўжэння праграмы на новую пяцігодку.*



## КОРАТКА

- **Беларусь пабудуе ў Кеніі завод жалезабетонных канструкцый і рыбаводчую ферму агульным коштам каля $104 млн.**
- Страхавыя ўнёскі ў Беларусі ў I паўгоддзі выраслі на 13,6 %.
- **Чэмпіянат Еўропы па муай-тай пройдзе ў мінскім Палацы спорту з 4 да 11 лістапада.**
- У лесе каля вёскі Запалякі (Маладзечанскі раён) грыбнік знайшоў авіябомбу.

ISSN 1990 - 763X

На парадку дня

# Рэцэпты абнаўлення



Маладыя медыкі ўрач агульнай практыкі Юлія ПРАСВІРЫНА *(на фота справа)* і памочнік урача Крысціна УСЕНЯ працуюць у 39-й мінскай паліклініцы. Юлія скончыла Віцебскі медыцынскі ўніверсітэт, а потым паспяхова скончыла і ардынатуру, а Крысціна сёлета атрымала дыплом Мінскага медыцынскага каледжа. Цяпер дзяўчаты працуюць у адной камандзе, і гэты здымак зроблены на іх змене ў час прыёму хворых.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Як у медыцыне лечаць «кадравы голад» і заахвочваюць урачоў заставацца ў малых гарадах

**Больш за 80 % медыкаў, па звестках Міністэрства аховы здароўя, застаюцца працаваць на тых месцах, дзе праходзілі размеркаванне. Сёлета 1 жніўня больш за 9 тысяч маладых спецыялістаў папоўнілі ўстановы аховы здароўя ва ўсёй краіне. Сярод іх 5,5 тысячы ўрачоў і інтэрнаў і больш за 3,5 тысячы чалавек сярэдняга медыцынскага персаналу. Найбольшы недахоп урачоў адчуваўся ў Мінску і Мінскай вобласці, сярэдняга медыцынскага персаналу — у Гомельскай і Гродзенскай абласцях. Пра тое, як медыкаў заахвочваюць заставацца ў рэгіёнах, пра вялікія магчымасці малых гарадоў, а таксама пра тое, чым урач агульнай практыкі адрозніваецца ад участковага тэрапеўта, расказалі спецыялісты падчас наведвання 39-й гарадской клінічнай паліклінікі Мінска.**

### Больш магчымасцяў зарабіць

— Самай актуальнай праблемай пры замацаванні кадраў з'яўляецца забеспячэнне іх жыллём, прычым якасным, каб спецыяліст адчуваў сябе камфортна, — арэнднай кватэрай ці домам. У тых рэгіёнах, дзе гэта пытанне вырашана, не маюць «кадравага голаду», — расказвае **начальнік упраўлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі Міністэрства аховы здароўя Вольга МАРШАЛКА.** — Асаблівасць нашага размеркавання ў тым, што на яго прыязджаюць наймальнікі і набіраюць спецыялістаў, у якіх маюць патрэбу. І такім чынам многія ўстановы аховы здароўя «закрыты пад ключ» — цалкам запоўнілі вакансіі. Наймальнік расказвае, у якіх умовах будзе жыць і працаваць малады спецыяліст, якой будзе заработная плата, некаторыя адвозяць і знаёмяць з сітуацыяй на месцах. Такім чынам, малады доктар загадзя ведае, у якіх умовах будзе працаваць — і ехаць не страшна.

Зарплата медыка, падкрэслівае Вольга Маршалка, часта вышэйшая менавіта ў невялікіх гарадах. Акрамя ўсіх выплат і кампенсацый, якія гарантавана атрымлівае любы малады спецыяліст, гэта яшчэ і так званыя сельскія пад'ёмныя, а таксама магчымасць працаваць больш чым на адну стаўку.

— У маленькіх гарадках не заўсёды ёсць поўная стаўка вузкага спецыяліста. Калі малады ўрач пажадае прайсці перападрыхтоўку, ён зможа заняць гэтыя 0,25 ці 0,5 стаўкі і атрымліваць большую зарплату. У сталіцы ж усе стаўкі звычайна запоўнены, не заўсёды ёсць магчымасць маладому спецыялісту знайсці падпрацоўку.

СТАР. 4

Слабы пол?

## ДЗЯЎЧАТЫ, НА ПАКОСЫ!

За перамогу на «Спораўскіх сенакосах — 2019» будуць змагацца і жаночыя каманды



**Галоўнай падзеяй экалагічнага фестывалю, які пройдзе ў гэтую суботу ў вёсцы Высокае Бярозаўскага раёна, стане XIII чэмпіянат па ручной касьбе. Больш за 20 камандаў з розных абласцей Беларусі заявілі пра свой удзел у гэтым цікавым спаборніцтве. Выйдуць на пакос і прадстаўніцы трох жаночых камандаў, сярод якіх і супрацоўніцы Бярэзінскага біясфернага запаведніка Вольга МАСКАЛЁВА і Наталля ФРАЛОВА.**

СТАР. 4




# Калектыўная дапамога, экіпажы-тысячнікі і жанчыны за штурвалам

## Тэмпы ўборкі ўраджаю і паказчыкі прадукцыйнасці культур вышэйшыя за леташнія

**Гэта стала магчыма дзякуючы прынятым на найвышэйшым узроўні і на месцах рашэнням, высокай прафесійнай гатоўнасці кадраў і іх самаадданай працы — такое меркаванне выказаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення — начальнік упраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль ЯДЛОЎСКІ.**

«Збожжавых убрана 75 працэнтаў і намалочана больш за 5 мільёнаў тон збожжа. Гэта на 31 працэнт больш, чым у гэты час летась. Плюс 4,5 цэнтнера з гектара перавышэнне ўраджайнасці. На 15 працэнтаў тэмпы ўборкі на 13 працэнтаў вышэйшыя, чым у мінулым годзе. Адпаведна і пастаўкі збожжа ідуць лепш (на 23 працэнты) — ужо 66 працэнтаў збожжа дзяржаве. Мы ўпэўненыя, што сёлета харчовае збожжа будзе пастаўлена ў поўным аб'ёме, і прадпрыемствы хлебапякарнай і перапрацоўчай прамысловасці недахопу адчуваць не будуць», — паведаміў на прэс-канферэнцыі ў сераду Васіль Ядлоўскі.

Ідзе актыўная ўборка льнотрасты. Тут таксама тэмпы і паказчыкі вышэйшыя за леташнія: выцерблена на 30 працэнтаў больш лёну, а ўраджайнасць вырасла на 49 працэнтаў.

Паралельна нарыхтоўваюць і травяныя кармы. Скошана 80 працэнтаў траў другім укосам, нарыхтавана на пяць працэнтаў больш кармавых адзінак.

«Прыняты і іншыя меры, якія дазваляюць забяспечваць і падтрымліваць дастаткова высокую гатоўнасць збожжаўборачных камбайнаў і зернесушыльных комплексаў — на ўзроўні 94—97 %», — адзначыў прадстаўнік міністэрства.

Пра спецыфіку і асаблівасці ўборачнай кампаніі ў сталічным рэгіёне расказаў **намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Сяргей ПРЫМАЧЭНКА:** «І прафсаюзны абласны камітэт, і камітэт па сельскай гаспадарцы гэту работу адсочвае. Людзі стараюцца працаваць і ведаюць, за што працуюць. Гэта ляжыць у аснове ў Мінскай вобласці. Кожны механізатар, кожны камбайнер ведае, колькі ён зарабляе».

Тэмп уборкі ў Мінскай вобласці складае да пяці працэнтаў штодзённа.

«Усяго ў нас тысячнікаў 373 экіпажы. 23 з іх пераадолелі планку ў дзве тысячы тон. Найбольш радуе, што 18 маладых экіпажаў пераадолелі планку ў тысячу і адзін экіпаж пераадолеў планку ў дзве тысячы», — ганарыцца вынікамі Сяргей Прымачэнка.

Спецыяліст падкрэсліў, што важная задача для вобласці — якасна і паўнацэнна нарыхтаваць кармы. Для гэтага на Міншчыне створаны ў тым ліку міжгаспадарчыя атрады. Прынцып работы такі — у адной гаспадарцы бяруць касілку, у другой граблі, у трэцяй прэс. Яны комплексна працуюць па трох гаспадарках, калі наступіла фаза ўборкі.

Прадстаўнікі прафсаюзаў праводзяць маніторынгі выканання ўмоў аховы працы, санітарных нормаў, забеспячэння гарачым харчаваннем. Прафсаюз работнікаў аграпрамысловага комплексу за прадуктыўную працу ўзнагародзіў больш за 3100 механізатараў. У краіне выznaчылі ўжо пяць экіпажаў, якія пераадолелі рубеж у 3000 тон.

«Сёлета ва ўборцы ўраджаю ўдзельнічаюць 59 жанчын-механізатараў. Яны альбо самі за штурвалам, альбо побач з імі, — расказаў **Мікалай ЛАБУШАЎ, старшыня Рэспубліканскага камітэта прафсаюзаў работнікаў аграпрамысловага комплексу.** — Такога ў свеце няма, каб жанчына была за штурвалам камбайна».

Усяго, па словах Васіля Ядлоўскага, у краіне планцуюць сабраць каля 8,5 мільёна тон збожжа разам з кукурузай у бункернай вазе. Калі ўлічваць сялянска-фермерскія гаспадаркі, прыватны сектар (там плануецца сабраць каля 400 тысяч тон збожжа) і ўжо намалочаныя 600 тысяч тон рапсу, выйдзе лічба ў 9,5 мільёна тон.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Парламенцкі дзённік

# Ад астравоў да цэнтра Еўропы

## Беларусь зацікаўлена ў інвестарах з Вялікабрытаніі

**Падчас работы Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Беларусі Фіёны ГІБ паміж дзвюма краінамі падпісаны мемарандумы аб гандлёва-эканамічным і мытным супрацоўніцтве, пагадненні аб пазбяганні двайнога падаткаабкладання і аб супрацоўніцтве ў аўтамабільных перавозках.**

«Дасягнуты сур'ёзны прагрэс у адносінах паміж нашымі краінамі на шмат якіх кірунках. Гэта і міжпарламенцкае супрацоўніцтва, і стасункі паміж міністэрствамі замежных спраў, і дыялог з членамі каралеўскай сям'і», — адзначыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** падчас сустрэчы з Фіёнай Гіб з нагоды завяршэння яе місіі ў Беларусі.

Пасол на пасадзе, якую заняла ў 2016 годзе, шчыльна працавала з беларускімі рэгіёнамі, прасоўвала здаровы лад жыцця. Пры падтрымцы Фіёны Гіб актыўна развівалася супрацоўніцтва ў культурнай і адукацыйнай сферах. Вялікабрытанія дапамагае ў аднаўленні тэрыторый, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, з 2010 года больш за восем тысяч дзяцей прайшлі аздараўленне на астравах.

«Вы зрабілі вельмі добры зачын у Рэспубліцы Беларусь, гэтага да вас не было. Таму будзем імкнуцца не толькі падтрымліваць дасягнуты ўзровень, але і прыбаўляць», — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. Ён асобна падзякаваў паслу за падтрымку парламенцкай дэлегацыяй Вялікабрытаніі беларускай рэзалюцыі на апошняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

На думку парламентарыя, тавараабарот паміж краінамі — гэта важна, але дэпутат спадзяецца на дыверсіфікацыю, гандаль новымі таварамі.

«Вельмі важны кірунак — гэта інвестыцыйнае супрацоўніцтва: стварэнне рабочых месцаў, павышэнне ўзроўню жыцця людзей, зарплаты. Таму, зразумела, мы зацікаўлены ў інвестарах у фармацэўтыцы, машынабудаванні, энергетыцы, парку «Вялікі камень». Умовы створаныя, у апошнія гады сур'ёзна працавалі над нарматыўна-прававымі актамі ў гэтай сферы», — звярнуў увагу Уладзімір Андрэйчанка.

Фіёна Гіб у сваю чаргу паведаміла, што ў Вялікабрытаніі расце інтарэс да Беларусі ў плане вядзення бізнесу. Зараз краіны актыўна абмяркоўваюць шырокі спектр ініцыятыў. Міністэрства эканомікі Беларусі зацікаўлена вывучыць брытанскі досвед па падтрымцы малых і сярэдніх прадпрыемстваў. Распрацоўваецца візіт дэлегацыі ў Вялікабрытанію для навучання і наладжвання кантактаў з калегамі.

«Усе пасольствы Вялікабрытаніі ў краінах Усходняга партнёрства працуюць над тым, каб запрасіць дзве-тры кампаніі са сваіх дзяржаў увосень на роўд-шоу сустрэчца з магчымымі брытанскімі партнёрамі», — праінфармавала дыпламат. Па яе словах, у цэнтры ўвагі — сельская гаспадарка, высокія тэхналогіі і ахова здароўя.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Выбары-2019

# Галасаваць — па карце

## Інфармацыя пра выбарчыя акругі даступна ў электронным выглядзе

**На карце Нацыянальнага кадастравага агенцтва пачаў працаваць слой «Выбарчыя акругі па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў», паведамілі ў Цэнтрвыбаркаме.**

Слой адлюстроўвае межы выбарчых акруг і месца знаходжання акружных выбарчых камісій пры правядзенні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання, а таксама змяшчае тэкставае апісанне акруг.

На сайце Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў у адкрытым доступе з'явілася інфармацыя пра выбары: адпаведныя вытрымкі з Выбарчага кодэкса, Указ Прэзідэнта, актуальныя паведамленні. Таксама апублікаваныя пастановы ЦВК, зацверджаныя на апошнім пасяджэнні, і метадычныя дапаможнікі для выбарчых камісій.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Пляцоўка перагавораў

# Разам адысці ад бездані

**Асноўнымі тэмамі форуму «Мінскі дыялог — 2019», які адбудзецца 7-8 кастрычніка ў беларускай сталіцы ўжо другі раз і пройдзе пад назвай «Еўрапейская бяспека: адысці ад краю бездані», стануць стратэгічная стабільнасць, кантроль над узбраеннямі і меры даверу ў галіне бяспекі, будучыня ЕАЭС, патэнцыял ініцыятывы «Пояс і шлях» ды іншае.**

Пра асноўную задачу форуму расказаў **прадстаўнік арганізатараў, дырэктар Савета па міжнародных адносінах «Мінскі дыялог» Яўген ПРЭЙГЕРМАН:** «Пляцоўкі ва Усходняй Еўропе, а можа быць і шырэй, ва ўсёй Еўропе, дзе людзі гавораць не адно аб адным, а адно з адным і займаюцца не накручваннем напружання, якое існуе, а, наадварот, шукаюць кропкі судакранання, каб напружанасць зніжаць, па сутнасці, няма. Мы палічылі, што важна, каб такая пляцоўка была».

Працаваць удзельнікі форуму будуць у некалькіх фарматах: пленарных, інтэрактыўных сесій, вячэрніх панэляў, рабочых сняданкаў і партнёрскіх мерапрыемстваў.

Спікерамі форуму будуць вядучыя эксперты з усяго свету. Свой удзел ужо пацвердзілі экс-камандуючы арміяй ЗША ў Еўропе генерал Бен Ходжас, экс-намеснік генеральнага сакратара НАТА Аляксандр Вершбоў, дырэктар Інстытута Еўропы РАН Аляксей Грамыка. Будуць і прадстаўнікі трохбаковай кантактнай групы па ўрэгуляванні сітуацыі на Данбасе.

Нагадаем, што на першым форуме «Мінскі дыялог» у маі 2018 года выступаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, а ў складзе ўдзельнікаў сустрэчы былі генеральны сакратар АБСЕ, намеснік памочніка генеральнага сакратара НАТА па палітычных пытаннях і палітыцы бяспекі. Летась мерапрыемства сабрала больш за 500 удзельнікаў з 59 краін свету.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Да сітуацыі ў Кыргызстане



Як паведамлялася раней, 7 жніўня спецназ распачаў спробу затрымання экс-прэзідэнта Кыргызстана Алмазбека Атамбаева ў яго рэзідэнцыі ў сяле Кой-Таш недалёка ад Бішкека. Паводле апошніх звестак, у выніку сутыкненняў прыхільнікаў экс-кіраўніка дзяржавы і байцоў спецназа пацярпелі 52 чалавекі.

Прэзідэнт рэспублікі Сааранбай Жээнбекаў правёў учора пазачарговае пасяджэнне парламента. Экстранная сесія дэпутатаў прысвечана грамадска-палітычнай сітуацыі ў краіне.

У медыцынскіх установах застаюцца 27 супрацоўнікаў дзяржкамітэта нацыянальнай бяспекі, пяцёра з іх атрымалі агнястрэльныя раненні. Адзін са спецназаўцаў памёр. Таксама паведамляецца, што падчас спецаперацыі было згублена і захоплена прыхільнікамі Атамбаева каля 40 адзінак агнястрэльнай зброі і больш за дзве тысячы патронаў.

Учора вечарам стала вядома, што экс-прэзідэнт рэспублікі Алмазбек Атамбаеў затрыманы, ён здаўся сілавікам.

**«У Беларусі з трывогай назіраюць за становішчам у Кыргызстане, дзе сілавая аперацыя ў дачыненні да былога прэзідэнта Атамбаева прывяла да гібелі супрацоўніка праваахоўных органаў, траўмаў і раненняў грамадзян, — гаворыцца ў паведамленні МЗС нашай краіны. — Разлічваем на тое, што кіраўніцтву Кыргызстана ўдасца забяспечыць вяршэнства закона, стабільнасць у дзяржаве і пазбегнуць далейшай эскалацыі сітуацыі, якая тоіць у сабе небяспеку чалавечых ахвяр».**

### Сепаратысты Паўднёвага Емена распачалі спробу перавароту ў Адэне

Сепаратысты з Паўднёвага пераходнага савета заклікалі да звяржэння ўрада прэзідэнта Емена Абд Рабу Мансура Хадзі, якога падтрымлівае Саудаўская Аравія. Як паведаміла газета Daily Star, атрады сепаратыстаў распачалі спробу перавароту ў паўднёвай сталіцы Адэне і атакавалі ў раёне прэзідэнцкага палаца баевікоў ісламісцкай узброенай міліцыі «Аль-Іслах». У выніку ўзброеных сутыкненняў ёсць забітыя і параненыя.

Раней Паўднёвы пераходны савет абвясціў аб усеагульнай мабілізацыі, абвінаваціўшы прэзідэнта Абд Рабу Мансура Хадзі ў сувязях з ісламісцкай асацыяцыяй «Браты-мусульмане». У руках сепаратыстаў знаходзіцца цяпер раён Хор-Максар, адтуль яны пагражаюць прэзідэнцкаму палацу «Эль-Маашык».

### Вучоныя Паўднёвай Афрыкі адкрылі новы від дыназаўраў

Палеантолагі ПАР адкрылі і склалі апісанне новага віду дыназаўраў, паведамляе партал PeerJ. Дзякуючы даследаванням з дапамогай камп'ютарнай тамаграфіі міжнародная каманда вучоных прыйшла да высновы, што скамянелы чэрап, які каля 30 гадоў пыліўся ва універсітэцкай калекцыі пад Іаганэсбургам, належаў зусім не тым дагістарычным жывёлам, да якіх яго аднеслі.

«Гэты зусім новы від «хаваўся», застаючыся ўвесь час навідавоку». Ён быў знойдзены амаль чатыры дзясяткі гадоў таму, а апошнія гадоў 30 праляжаў у калекцыі Інстытута эвалюцыйных даследаванняў на складзе універсітэта.

Фінансы

# Інфляцыя — не больш за 5 %?

**На днях у Нацыянальным банку прайшоў брыфінг па выніках пасяджэння праўлення Нацбанка па грашова-крэдытнай палітыцы. З асноўнымі рашэннямі і прагнозамі рэгулятара журналістаў азнаёміў старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел КАЛАУР.**



Фота БелТА.

## Рызыкі росту цэн вышэй за 5 % — малыя

Рост цэн у другім паўгоддзі замарудзіцца. Да канца года інфляцыя стабілізуецца паблізу мэтавага паказчыка ў 5 %, упэўнены Павел Калаур.

— Разам з тым мы не выключаем, што гадавая інфляцыя ў ліпені гэтага года будзе вышэйшыя за ўзровень чэрвеня, — заўважыў старшыня праўлення Нацбанка. — Але гэта абумоўлена эфектам нізкай базы мінулага года. Нагадаю, у ліпені 2018 года было зафіксавана рэкорднае для гэтага перыяду года зніжэнне цэн на плодаагародніннуе прадукцыю. Акрамя таго, адбылося змяненне тэрмінаў павышэння тарыфаў на паслугі ЖКГ: у бягучым годзе яно адбылося ў ліпені, у той час як у 2018 годзе павышэнне такіх тарыфаў было ў верасні. Менавіта за кошт гэтых пазіцый мы можам убачыць больш высокія лічбы па інфляцыі ў ліпені гэтага года. У той жа час базавая інфляцыя, паводле нашых ацэнак, працягне зніжацца. У наступныя месяцы інфляцыя будзе запавольвацца і да канца 2019 года складзецца каля 5 %.

Рызыкі росту цэн вышэй за 5 % малыя за кошт нейтральнага ўплыву на дынаміку інфляцыйных працэсаў унутранай эканомікі. Так, нізкаму росту цэн будуць спрыяць зніжэнне інтэнсіўнасці спажывецкага крэдытавання, а таксама той факт, што рост заробкаў, як плануецца, будзе заснаваны на павышэнні прадукцыйнасці працы.

Таксама Нацбанк чакае, што паступленне новага ўраджаю дасць магчымасць нівеліраваць рост харчовых цэн другой паловы мінулага года і знізіць верагоднасць узнікнення кан'юнктурных шокаў у найбліжэйшай будучыні.

Павел Калаур адзначыў і зніжэнне знешніх праінфляцыйных рызык, асабліва на кароткатэрміновым гарызонце. «У першую чаргу гэта датычыцца Расіі, дзе сфарміравалася ўстойлівая тэндэнцыя да запавольвання інфляцыі. Банк Расіі палепшыў прагноз па росце спажывецкіх цэн, што дазволіла яму ў ліпені бягучага года чарговы раз знізіць ключавую стаўку», — сказаў Павел Калаур.

І ЗША, і Еўрапейскі цэнтральны банк таксама заявілі пра змякчэнне манетарнай палітыкі на фоне паслаблення інфляцыйнага ціску і запавольвання сусветнай эканомікі.

Тэндэнцыя змяншэння праінфляцыйнага ўплыву знешніх фактараў на ўнутраныя цэны захаваецца і ў сярэднетэрміновым перыядзе, лічаць у Нацбанку. Усе гэтыя фактары ў сукупнасці прадвызначылі, па словах Паўла Калаура, рашэнне праўлення Нацыянальнага банка аб зніжэнні стаўкі рэфінансавання на 50 базісных пунктаў.

## Стаўкі па крэдытах могуць нязначна вагацца

Варта адзначыць, што новая стаўка рэфінансавання, анансаваная Нацбанкам 7 жніўня, зніжана да рэкорднага нізкага ўзроўню — з 10 % да 9,5 % гадавых. Яшчэ ні разу за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі стаўка рэфінансавання не апускалася ніжэй за 10 %.

Як гэты крок адаб'ецца на працэнтных стаўках па крэдытах? Павел Калаур лічыць, што з улікам зніжэння стаўкі рэфінансавання цяпер будуць зніжацца і стаўкі па крэдытах на жыллё. Разам з тым прадстаўнік Нацбанка адзначае, што працэнтныя стаўкі на рынку залежаць ад рызык. Таму ў будучыні магчымыя нявялікія ваганні ў абодва бакі. «Гэта нармальны стан рынку», — лічыць ён.

## Тэмпы росту спажывецкага крэдытавання замарудзяцца

Нацыянальны банк чакае запавольвання тэмпаў росту спажывецкага крэдытавання. Гэта павінна адбыцца нават пры зніжэнні ставак на грашова-крэдытным рынку і будзе звязана з комплексам мер, накіраваных на мінімізацыю сістэмнай рызыкі фінансавага сектара. Таксама, па словах Паўла Калаура, мае месца і насычэнне попыту.

Спажывецкае крэдытаванне, паводле яго слоў, пры гэтым не знізіцца, гэта значыць яно працягне нарастаць, але не тымі тэмпамі, якія назіраліся раней.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення манетарнай палітыкі і эканамічнага аналізу Нацыянальнага банка Дзмітрый МУРЫН** адзначыў, што дадатковыя меры для стрымлівання спажывецкага крэдытавання цяпер не разглядаюцца. А сярод прычын яго запавольвання назваў, акрамя іншага, вычарпанне эфекту нізкай базы. «Да 2017 года крэдытаванне было стабільным, не нарастала, потым пачаўся бурны аднаўленчы рост. Па мінулым годзе быў прырост 45 %, зараз ён запаволіўся да 34 %», — заявіў Дзмітрый Мурын.

Прадстаўнікі Нацбанка таксама заявілі аб тым, што бурнае развіццё картаў растэрміновак сябе вычарпала.

## Усе адміністрацыйна рэгуляваныя цэны будзе ўзгадняць МАРГ

У тым ліку гэта датычыцца і цэн на паліва. Ужо цяпер усё павышэнне цэн ідзе непасрэдна праз Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. Выключэннем былі цэны на паліва. «Зараз падрыхтавана рашэнне, і калі яно будзе прынята, у наступным усё павышэнне рэгулюемых цэн будзе праходзіць выключна толькі праз МАРГ», — заявіў Павел Калаур.

— Гэта прынцыповая пазіцыя і непасрэдна МАРГ, і Нацыянальнага банка. Мы глыбока перакананыя, што ўсё павінна быць у адных руках, павінна быць забяспечана каардынацыя дзеянняў як мінімум у рамках прагнозаў і разлікаў з боку Нацыянальнага банка і МАРГ, — сказаў старшыня праўлення Нацбанка. Канчатковае рашэнне гэтага пытання застаецца за кіраўніком дзяржавы.

## Бюджэт 2020 года закладзены з дэфіцытам

Бюджэт 2020 года будзе сфарміраваны з дэфіцытам у 1,3 млрд рублёў, паведаміў на брыфінгу **намеснік старшыні праўлення Нацбанка Сяргей КАЛЕЧЫЦ.** Але нейкага ўплыву на ўзмацненне інфляцыі, паводле яго слоў, пры гэтым не чакаецца. Гэта звязана з тым, што такі дэфіцыт закладзены не з-за апераджальнага росту расходаў бюджэту, які мог бы паўплываць на інфляцыю, а, хутчэй, у сувязі са змяненнем даходнай часткі, паколькі бюджэт вярстаецца з базавага, гэта значыць дастаткова кансерватыўнага развіцця эканомікі. Там закладваюцца асцярожныя падыходы і магчымасць неатрымання шэрагу валютных паступленняў, якія былі раней.

**Святлана БУСЬКО.**

Факт

## НАШЫ КІНОЛАГІ — НАЙЛЕПШЫЯ

**На Армейскіх міжнародных гульнях, якія ў гэтыя дні праходзяць на палігонах некалькіх дзяржаў, каманда ваенных кінолагаў з Беларусі ўзначаліла турнірную табліцу па выніках практыкавання «дог-біятлон» у індывідуальнай гонцы.**

Удзельнікі павінны былі пераадолець дыстанцыю ў 3200 метраў. На ёй трэба было двойчы трапіць у мішэнь з вінтоўкі — у становішчы лежачы і стоячы. Згодна з правіламі, сабака мусіў пастаянна рухацца наперадзе важатага і не адхіляцца ад маршруту. Другое месца заняла каманда Расіі. «Бронза» па выніках першага этапа — ва ўзбекскіх кінолагаў. У конкурсе «Верны сябар» таксама бяруць удзел каманды з Казахстана і Алжыра. Спаборніцтвы ў кінолагаў скончацца 11 жніўня.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## ВЫРАТАВАЛІ ПА 40 ГА ПШАНІЦЫ

**У адзін дзень гэта адбылося ў Мінскім і Карэліцкім раёнах.**

Як паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях, спачатку ўдзень ратавальнікам паступіла паведамленне, што ў полі каля вёскі Міханавічы Мінскага раёна гарыць пшаніца на корані. Агульная плошча пасеваў складала 40 гектараў.

На месца прыбылі падраздзяленні МНС, якія адстаялі ад агню 39,5 гектара. Ніхто не пацярпеў. У выніку полымем знішчана паўгектара пшаніцы. Прычына здарэння высвятляецца. Версія, якая разглядаецца, — падпал.

У той жа дзень праз дзве з паловай гадзіны паведамленне аб загаранні яравой пшаніцы на корані паступіла з Карэліцкага раёна — агонь распаўсюджваўся на полі каля вёскі Вялікая Слабада. У выніку пажару было знішчана два гектары пасеваў. Яшчэ 40 гектараў выратавалі работнікі МНС разам з работнікамі КСУП. Прычына здарэння ўстанаўліваецца.

Нагадаем, літаральна днямі поле з пшаніцай у Дзяржынскім раёне падпалілі дзеці. У выніку іх свавольства згарэла траціна гектара пасеваў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ІХ РАШЭННІ

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 10 жніўня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. З 9.00 да 12.00 у суботу на званкі будуць адказваць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Генадзь Іосіфавіч БАРЫСЮК. Тэл. 8 016 221 31 21;

кіраўнік спраў ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч СЫСОЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатолеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч МАКАР. Тэл. 8 017 500 41 60;

намеснік старшыні МІНСКАГА гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Даты

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

## «ЗВЯЗДА» ПРЫМАЕ ВІНШАВАННІ!

### Так-так: сёння, 9 жніўня, ёй спаўняецца... 102!

Зрэшты, сталым чытачам-падпісчыкам нагадваць пра гэта не варта: разам з намі, і здаецца, толькі ўчора, яны святкавалі звяздоўскія 100, 90, 80, 70...

«Усё жыццё газету выпісвалі бацькі. Мы, дзеці, атрымалі яе ў спадчыну», «У ваш музей дасылаю нумар за 22 мая 1945-га, які знайшоў на гарышчы», «Чытаем «Звязду» з канца 60-х», «У вас друкаваўся мой верш...», «Газета дапамагла адрамантаваць дарогу...», «Некалі ў звяздоўскай латарэі мы выйгралі халадзільнік...», «Бабуля нас з мужам блаславіла іконай Казанскай Божай маці. У ёй з тыльнага боку (гэта мы потым убачылі) быў нумар «Звязды»...

Цытаваць лісты можна доўга. Прынамсі, крылатае:

*Ты адно запомні, браце,*
*Са «Звяздой» святлей у хаце!*

— таксама адтуль — з рэдакцыйнай пошты.

А значыць, з днём нараджэння трэба віншаваць не толькі нас, супрацоўнікаў газеты, але і чытачоў! Сто гадоў вам — у добрым здароўі... У дастатку і згодзе!..

А тады і газеце — яшчэ раз — сто!

**Звяздоўцы.**

**Ад іх жа шчырае прывітанне і нізкі паклон усім, хто працаваў у газеце раней.**

Надвор'е

## Цёпла і з дажджамі

**Цыклон, які сапсаваў надвор'е ў Беларусі ў чацвер, у пятніцу пакіне межы нашай тэрыторыі. Але аднастайнай сінаптычная абстаноўка ў прыканцы тыдня не будзе. Падрабязней пра яе расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



rg.ru

Такім чынам, у пятніцу раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Удзень чакаецца ад 20 да 26 градусаў цяпла.

У суботу мы акажамся ў зоне павышанага атмасфернага ціску. Але з некаторымі асаблівасцямі — ноччу і раніцай па паўночным ускодзе будзе выяўляцца ўплыў няўстойлівай паветранай масы. А вось удзень да заходніх межаў наблізіцца атмасферны фронт. Таму там пройдуць невялікія дажджы. Ноччу і раніцай чакаюцца слабыя туманы. Холадна не будзе — уначы ад 8 да 13, удзень — ад 21 да 27 цяпла.

Нядзеля разам з тым выдасца дажджлівая. Атмасферныя франты з Заходняй Еўропы прынясуць з сабой кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах не абыдзецца без навальніцы. Ноччу і раніцай таксама чакаюцца слабыя туманы. Уначы слупок тэрмометра не апусціцца ніжэй за 11—18 градусаў. Удзень жа будзе ад 20 да 26 са знакам «плюс».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Рэцэпты абнаўлення



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі ўрач-інтэрн атрымлівае ў сталіцы 520 рублёў у месяц, малады спецыяліст — каля 600, то ў невялікіх гарадах іх зарплата складае адпаведна 650—700 рублёў. **Галоўны ўрач 39-й гарадской клінічнай паліклінікі Мінска Вольга ЕСМАНЧЫК** на прыкладзе сваёй установы расказала, што маладым спецыялістам выплачваюцца пад'ёмныя — сродкі ў памеры апошняй стыпенды.



**Вольга ЕСМАНЧЫК *(у цэнтры)* з маладымі спецыялістамі.**

Тым, хто змяніў месца жыхарства — кампенсацыя ў сувязі з пераездам. Надбаўка па кантракце складае 50 %, каля 20 % — прэмія. Кожнаму ўстанаўліваецца індывідуальная надбаўка за складанасць і напружанасць працы. Акрамя гэтага, існуюць квартальныя выплаты ў памеры базавай велічыні. Пры прадстаўленні дагавора найму жылля таксама існуе кампенсацыя — ад 1 да 3 базавых велічынь.

Павышаць кваліфікацыю сваіх спецыялістаў імкнецца кожны кіраўнік медыцынскай установы, бо ён зацікаўлены ва ўкамплектаванні кадрамі, кажа Вольга Есманчык.

— У 2014 годзе да нас размяркавалася памочнік урача, з 1 жніўня гэтага года яна ўжо прызначана старшай медыцынскай сястрой паліклінікі. Яна неаднойчы праходзіла павышэнне кваліфікацыі, здала на ўсе кваліфікацыйныя катэгорыі. Зараз завочна атрымлівае вышэйшую адукацыю, і я падтрымліваю яе імкненні, зацікаўлена, каб спецыяліст у нас заставаўся працаваць, таму прызначыла яе старшай медыцынскай сястрой.

Вольга Есманчык расказвае, што паліклініка (а яна адкрылася ў новым мікрараёне сталіцы ў 2014 годзе) укамплектавана медыцынскімі кадрамі з сярэдне-спецыяльнай адукацыяй на 86 %, вышэйшай — на 96 %. Штогод сюды размяркоўваецца 19—20 маладых спецыялістаў. Сёлета з 1 жніўня на работу выйшла 15 новых урачоў, тры памочнікі ўрача, фельчар-лабарант і медыцынская сястра.

— Як кіраўнік, я адчуваю радасць, што вакансіі запоўнены. З іншага боку, гэта вялікая адказнасць. Кожнаму маладому спецыялісту мы прызначаем настаўніка з ліку самых вопытных спецыялістаў, які яго курыруе.

Цякучасць кадраў у паліклініцы невялікая, падкрэслівае Вольга Есманчык. Штогод звальняецца адзін-тры чалавекі, сёлета, напрыклад, сышоў адзін урач і дзве медыцынскія сястры.

— Мы размаўляем са спецыялістамі і ведаем іх патрэбы. Гэта дазваляе захаваць людзей. Напрыклад, наш урач-тэрапеўт пасля адпрацоўкі размеркавання пажадала прайсці перападрыхтоўку і цяпер працуе эндакрынолагам. Пры жаданні накіроўваем на курсы павышэння кваліфікацыі, каб была магчымасць здаць на кваліфікацыйную катэгорыю і павысіць зарплату. Таксама стараемся забяспечваць ложка-месцамі ў інтэрнаце. Сёлета адной сям'і далі пакой у інтэрнаце, двум медсёстрам — ложка-месцы.

### Даступнасць медыцыны — адна з самых высокіх у свеце

Каментуючы тэму адтоку медыцынскіх кадраў, Вольга Маршалка адзначыла, што ў Беларусі забяспечанасць медыкамі адна з самых высокіх у свеце. Згодна са статыстыкай, на 10 тысяч насельніцтва ў нас прыходзіцца 55 урачоў. У еўрапейскіх краінах гэты паказчык складае 38.

— Даступнасць нашай медыцыны — адна з самых высокіх у свеце. У Францыі, напрыклад, трохмесячныя чэргі чакання прыёму спецыяліста. Так, у нас 20 % работнікаў знаходзіцца ў дэкрэтных адпачынках, бо 85 % працоўных у галіне — жанчыны. І гэта добра, што ўрачы нараджаюць і вырашаюць дэмаграфічную праблему. Пры гэтым ёсць добры «запас» — пенсіянеры. Сёння ў сістэме аховы здароўя іх каля 18 %. Мы рыхтуем шэраг праектаў па прыцягненні ў медыцыну хлопцаў. Дарэчы, закон аб адтэрміноўках сыграў нам на карысць: той, хто не паступіў ва ўніверсітэты, пайшоў вучыцца ў каледжы.

Спецыяліст падкрэсліла, што за мяжу выязджае не так шмат медыкаў, як некаторыя лічаць.

— Наша ўпраўленне выдае афіцыйныя пісьмы, якія неабходны для ўладкавання на работу за мяжой. І мы вядзём улік гэтых спецыялістаў. Апошнія два гады лічба тых, хто з'язджае, стабільная — 190—200 чалавек. Гэта няшмат, улічваючы што ў сістэме працуе 53 тысячы ўрачоў. Без афіцыйнага пісьма можна таксама паехаць у некаторыя краіны, напрыклад Расію. Але апошнім часам там змянілася сістэма допуску да работы, і пачаўся адваротны адток. Гэтыя спецыялісты таксама прыходзяць да нас, каб атрымаць допуск да работы ў Беларусі. Пастаянная працоўная міграцыя існавала і будзе існаваць, гэта нармальная з'ява. Мы прапрацоўваем нарматыўны дакумент, які дазволіць падчас доўгай стажыроўкі за мяжой не звальняцца з нашай медыцынскай установы. Асноўная прычына тых, хто з'язджае, дарэчы, — выйшла замуж за грамадзяніна іншай краіны.Той, хто едзе ў рабочым фармаце, часта вяртаецца назад. Малады спецыяліст на старце атрымлівае ў Еўропе дзве тысячы еўра. З усімі выплатамі і расходамі яму застаецца тысяча ці нават менш. Прайшоўшы перападрыхтоўку на кардыёлага, скажам, і працуючы на паўтары стаўкі, у нас можна зарабляць не нашмат менш. Пасля пяці гадоў работы можна сумяшчаць з практыкай у прыватным медыцынскім цэнтры.

Вольга Маршалка адзначыла, што сёлета лічбы набору ў медыцынскія ВНУ і каледжы былі павялічаны: ва ўніверсітэты — на 200 чалавек, каледжы — на 450. Конкурс, дарэчы, быў надзвычай высокі:

— Сёлета ён складаў да пяці чалавек на месца — такога мы не бачылі некалькі апошніх гадоў. І нас гэта радуе. За ўзровень падрыхтоўкі нашых спецыялістаў за мяжой не сорамна.



Наша краіна, дарэчы, адна з нямногіх, дзе ўрачы пасля заканчэння ВНУ могуць ажыццяўляць дзейнасць па 19 кірунках — хірург, кардыёлаг, гінеколаг, эндакрынолаг, неўролаг і іншых. Спецыялізацыя пачынаецца з 6-га курса і працягваецца падчас праходжання інтэрнатуры. За мяжой усе выпускнікі спачатку працуюць урачамі агульнай практыкі, а спецыялізацыю атрымліваюць на працягу трох-чатырох гадоў (па некаторых спецыяльнасцях — да 10 гадоў). Таму наша адукацыя, на думку спецыялістаў, прыцягвае замежных студэнтаў. Сёння ў беларускіх медуніверсітэтах вучыцца пяць тысяч студэнтаў з 72 краін свету.

### Хвароб шмат — доктар адзін

Масавая падрыхтоўка ўрачоў агульнай практыкі пачалася ў Беларусі з 2016 года. І да 2020 года ў паліклініках яны цалкам заменяць участковых тэрапеўтаў. Цяпер вядзецца іх перападрыхтоўка, яе прайшлі каля 65 % спецыялістаў. Урач агульнай практыкі будзе сумяшчаць шмат кірункаў дзейнасці і зможа выконваць функцыі неўролага, лор-урача, кардыёлага, эндакрынолага і іншыя. Такі спецыяліст працуе ў камандзе з памочнікам урача і медыцынскай сястрой. Будзе павялічаны і час прыёму: калі ўрач працуе ў тым ліку і з дзецьмі — да 20 хвілін, толькі з дарослым насельніцтвам — да 18 хвілін. Раней на аднаго пацыента ўчастковаму тэрапеўту адводзілася 12—15 хвілін. Зменшыцца і колькасць насельніцтва, якое абслугоўвае ўрач агульнай практыкі — з 1700 да 1500 чалавек. Кабінеты ўрача агульнай практыкі аснашчаюцца неабходным медыцынскім абсталяваннем.

**У Беларусі ў сістэме аховы здароўя працуе 300 тысяч работнікаў, з іх 170 тысяч — медыкі, у тым ліку 53 тысячы з вышэйшай адукацыяй, 115 тысяч — з сярэдне-спецыяльнай.**

**Алена КРАВЕЦ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

# ДЗЯЎЧАТЫ, НА ПАКОСЫ!



Фота Наталлі ТРАЦЦЭЎСКАЙ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— У спаборніцтвах па ручной касьбе прадстаўнікі запаведніка — як мужчыны, так і жанчыны — удзельнічаюць каля 15 гадоў, — расказала Вольга Маскалёва. — Пачыналі яшчэ ў 2004 годзе з падобнага чэмпіянату ў Польшчы, а потым дырэктар заказніка «Спораўскі» Вадзім Пратасевіч запрасіў у Высокае.

Як чалавек вясковы Вольга і да чэмпіянату ўмела карыстацца касой. Але спачатку яна, як і некаторыя іншыя ўдзельніцы, касіла траву адна і на «льготных» умовах (на меншай дыстанцыі). Калі ж сабралася каманда, вырашылі змагацца за прызы нароўні з мужчынамі (на што адважваліся не ўсе) — і не пашкадавалі пра гэта.

І ў апошнія гады, нягледзячы на складанасць сенакосу на балоце, усё больш жанчын імкнуцца праверыць свае сілы ў спаборніцтвах. Таму і прызы заваёўваць стала больш складана. Але, па словах Вольгі Маскалёвай, «Спораўскія сенакосы» — гэта не толькі змаганне за прызы, але і сустрэча з сябрамі, якімі сталыя ўдзельнікі чэмпіянату сталі за гэтыя гады.

— Сёлета бяром на «Спораўскія сенакосы» сваіх дзяцей, каб і яны адчулі атмасферу свята, што пануе на фестывалі, — падзялілася Вольга Маскалёва.

* * *

Змагацца за перамогу будуць і падчас футбола на балоце, які праходзіць у заказніку шосты год запар.

Для гасцей экафестывалю арганізатары падрыхтавалі насычаную забаўляльную праграму. Так, ахвотныя змогуць прайсціся па экалагічнай сцежцы, маршрут якой пракладзены па балоце, паназіраць за птушкамі на спецыяльна абсталяванай пляцоўцы, пракаціцца на конях, палётаць на дэльтаплане ці паветраным шары.

**Згодна з правіламі чэмпіянату, камандам неабходна на час (залічваецца і чысціня ўкосу) пракасіць паласу шырынёй 3 м і даўжынёй 100 м. Па выніках каманднага першынства найлепшыя касцы стартуюць у асабістым заліку на 100-метровай дыстанцыі з шырынёй пракосу 1,5 м.**

Праект «БЕЛМЕД» (фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца ПРААН, СААЗ, ЮНІСЕФ і ЮНФПА ў партнёрстве з Міністэрствам аховы здароўя) прэзентуе 35 мясцовых ініцыятыў, якія сталі пераможцамі трох конкурсаў «Будзь здаровы!». Запланаваны навучальныя, спартыўныя і творчыя мерапрыемствы: турнір дваровых гульняў, майстар-класы па скандынаўскай хадзьбе і гімнастыцы, асновах бяспечнай жыццядзейнасці, здаровым харчаванні, маляванні пяском і роспісе па шкле.

Завершыць мерапрыемствы канцэрт з удзелам папулярных беларускіх выканаўцаў Тэа, кавер-групы «Мята», групы «Цягні-Штурхай» і іншых творчых калектываў.

Дабрацца з райцэнтра да месца свята можна будзе бясплатна — адмысловыя аўтобусныя рэйсы адпраўляцца 10 жніўня з Бярозы ў Высокае.

Чэмпіянат па ручной касьбе «Спораўскія сенакосы» праходзіць на тэрыторыі рэспубліканскага біялагічнага заказніка «Спораўскі» з 2006 года. Гэта не толькі цікавае, але і карыснае для прыроды мерапрыемства. Дзякуючы ачышчэнню нізінных балот ад зарастання травой і хмызняком на гэтых участках пачынаюць гнездавацца рэдкія птушкі, у тым ліку і глабальна пагражаемы від — вяртлявая чаротаўка.

**Вераніка КОЛАСАВА.**




## Два чароўныя словы

Рвуцца маладыя некуды за мяжу, нібы там дык мёдам намазана. Ага, зараз! Я ніколі ў гэта не верыў, а калі б нехта сказаў, што паеду сам, дык, відаць, і пабіў бы! Аднак жыццё мудрэйшае, і яно, бывае, скруціць нас так...

Першай і некалі даўно ў Германіі апынулася мая сястра. Яны з мужам рэдкія працаголікі і прадпрымальнікі. У Беларусі (а тым больш на пачатку перабудовы) ім вельмі цесна было.

Не адразу, вядома ж, развярнуліся і там, на чужыне (ліха, як той казаў, хапілі напоўніцу), але ўрэшце ўсё ўладкавалася, утрэслася — зажылі. А вось у мяне — якраз наадварот: усё пайшло наперакос, і на роўнае ну ніяк не выверпнуць...

Што заставалася: прыняў запрашэнне сястры — паехаў. Не на голае месца, як быццам, — да сваіх: мне было дзе жыць, дзе працаваць. А ўсё роўна адчуваў сябе, як тая рыба на беразе: ні сям'і, ні радзімы... І без мовы — нібы аглушаны. Некалькі слоў па-нямецку ведаў: «Гітлер капут!», «Хэндэ хох!», «шлехт» — дрэнна, «гут» — добра, «данке» — дзякуй. А галоўнае, што нейкія новыя і вучыць не хацеў! Ну, не лезлі яны ў галаву, пакуль...

У тую раніцу, працуючы на чарговым аб'екце, мы з сястрой — будаўнікі найшырэйшага профілю — згледзелі, што ў пустуючым доме насупраць адчыненае акно. Першая думка была: нехта залез. Таму Галя на ўсякі выпадак набрала нумар паліцыі.

Спрацавала яна досыць хутка: да ўвахода ў дом падкаціла машына, з яе выскачылі двое — мужчына і жанчына ў паліцэйскай форме, абышлі пабудову, агледзелі.

Карацей, як для мяне, дык нічога цікавага: я працую сабе далей (якраз шрубакрут у руках), але ж бачу, што тая жанчына з паліцыі крочыць да нас, чую, што аб нечым размаўляе з сястрой (я, вядома ж, нічога не разумею) і сыходзіць — праўда, ужо з малатком (Галя, відаць, удружыла). Думаю сам сабе: «Бабскі розум: ну, трэба вам тое акно забіць, дык паклічце мужчыну, ці хоць падумайце, як? Бо яно ж калі цвік у раму заганяць малатком, — то альбо шыба на друз, альбо рама на трэскі... Прычым — з першага ўдару.

Што было рабіць? Хуценька ўзяў самарэз (хто не ведае — шрубка такая, укручваецца адвёрткай ці шрубакрутам), ля дома ўжо «дагнаў» паліцыянтку, ветліва адхінуў ад акна, прыставіў самарэз да рамы, шрубакрутам — ж-ж-жык і акно забітае.

— Гут? — пытаю ў жанчыны.

А тая, чую, нешта гергеча, гергеча, прычым так абурана!.. Трэба разумець, не падабаецца ёй мая работа? Ага — думаю, — ты б зараз лепей зрабіла...

Хацеў ужо развярнуцца ды пайсці — не пусціла: паклала руку на плячо, павярнула тварам да іншага акна і...

Толькі тут я ўбачыў, што за ім, у адным з пакояў, яе... напарнік стаіць (залез, відаць, каб праверыць, ці няма каго ўнутры), што ён таксама рукамі размахвае ды нешта лапоча.

Я «з разгону» хацеў пажартаваць: маўляў, папаўся жучка ў панскую ручку і хэндэ хох цяпер... Але ж — добра — паспеў апомніцца — прыкусіў язык, а то яны б зараз разабраліся, хто тут жучка... Ды паслалі — назад у Беларусь. А так...

Прыйшлося скарыстацца шрубакрутам яшчэ раз: выкруціць самарэз, адчыніць акно (выпусціць «на свабоду» паліцэйскага, папрасіць прабачэння), потым — зноў зачыніць...

І вось тут ужо пачуць і шчырае «данке!», і «гут». Пасля якіх (і наогул гэтай «сутычкі» з паліцыяй) сталі нейк запамінацца іншыя словы — стала засвойвацца мова. Страшна толькі пачаць. Страшна з'ехаць. Хоць лепей было б застацца.

**П. Л.,**
*г. Лейпцыг.*

## Калі збываюцца мары...

Ліпень, жнівень — гарачая пара, прычым не толькі для хлебаробаў — для ўчарашніх выпускнікоў. Адны экзамены здадзены, а вось другія...

Помню, як збіраўся паступаць у БДУ я сам, помню, як не пашчасціла, пасля чаго было прафтэхвучылішча, тэхнікум з адзнакай, інстытут, можна сказаць, з чырвоным дыпломам (трэба было выправіць адну адзнаку, але я не захацеў... Не мае гэта)

І вось праз трыццаць гадоў гісторыя як бы паўтараецца: ва ўніверсітэт сабралася мая дачка, мы разам пайшлі ў школу па характарыстыку.

Дырэктар, вядома ж, напісала яе — усё як належыць, але ўручаючы, не змаўчала: сказала, што конкурс вельмі вялікі, што каб яго, вось гэткі прайсці, патрэбна сур'ёзная падрыхтоўка, грунтоўныя веды. «Так што ты, — сказала дачцэ, — відаць, не паступіш... Але ж нічога — пойдзеш вучыцца ў каледж».

Карацей, і блаславіла нас, і суцешыла, праўда, ненадоўга: на дарогу дадому. А ўжо там — мора слёз і роспач!

Цяжка прыйшлося дачцэ ды і мне, як бацьку, бо я заўсёды вучыў, каб гналася болей за ведамі, а не за адзнакамі, каб мела няхай і «чацвёркі» (пры пяцібальнай сістэме), але такія, каб «выдатніцы» ім зайздросцілі.

Дачка ды і наогул дзеці мае ў школе вучыліся добра: з тымі ведамі маглі паступаць далей. А тут вось гэткі наказ...

І нават не адзін: у раённым аддзеле адукацыі не аказалася накіравання на патрэбную нам «гісторыю і беларускую мову».

— А на якія факультэты, — цікавімся, — ёсць?

— На нямецкую і англійскую мовы.

— Будзем браць? — пытаю у дачкі.

— Будзем, — згаджаецца яна.

— Але ж вы, — ёй падказваюць, — будзеце другой. Першай ідзе іншая дзяўчынка з сельскай школы, удзельніца алімпіяд...

— Нічога, хай абедзве ідуць, — гэта я ўжо кажу, — «на конкурсной аснове».

Хоць-нехаць, але ж тое накіраванне далі.

Да паступлення заставаўся месяц, цягам якога мы «патрэніраваліся» на пробным тэсціраванні па беларускай мове і павучыліся на курсах нямецкай... Аднакласніца-выдатніца не пазычыла, пашкадавала непатрэбны ёй падручнік па гэтым прадмеце, затое «немка» дала дачцэ дзве старэнькія кніжкі ды пажадала поспеху...

І ён, дзякуй богу, нам спадарожнічаў: тое, што некалі не збылося ў мяне, спраўдзіла мая дачка: паступіла, адвучылася і (мела рацыю дырэктар школы!) прыйшла ў педагагічны каледж — на працу ў якасці выкладчыцы!

| 3 | Экскаватор-погрузчик ЭП-Ф-П, 2007 г/в, регистрационный знак ЕА-3 89-65, шасси Беларус 82П, заводской номер 018, шасси 80200635 (инв. бух. № 1677дск) | 11 760,00 | 588,00 | 1 176,00 |
| 4 | Экскаватор-погрузчик ЭП-Ф-Ц, 2008 г/в, регистрационный знак ЕВ-3 11-86, шасси Беларус 82.1, заводской номер – 001, шасси 80880707 (инв. бух. № 0241дск) | 11 760,00 | 588,00 | 1 176,00 |
| 5 | Полуприцеп площадки МАЗ-9379 00-010, 2006 г/в, регистрационный знак А 1044 А-3, номер кузова (рамы) – Y3M 93790060000200, цвет серый (инв.бух. № 02441дск) | 6 336,00 | 316,80 | 633,60 |
| 6 | Полуприцеп платформа-панелевоз МАЗ-998500 010-01, 2009 г/в, регистрационный знак А 3627 А-3, номер кузова (рамы) – Y3M 99850090000269, цвет желтый (инв. бух. № 02465дск) | 5 508,00 | 275,40 | 550,80 |
| 7 | Грузовой седельный тягач МАЗ 543205-220, 2007 г/в, регистрационный знак AI 9709-3, номер кузова (рамы) – Y3M54320570003463, цвет белый (инв. бух № 02456дск) | 4 440,00 | 222,00 | 444,00 |
| 8 | Грузовой седельный тягач МАЗ 543302 220, 2007 г/в, регистрационный знак АВ 1970-3, номер кузова (рамы) – Y3M54330270001507, цвет белый (инв. бух № 02453дск) | 3 720,00 | 186,00 | 372,00 |
| 9 | Грузовой специальный автокран КРАЗ 250 КС 4562, 1990 г/в, регистрационный знак АА 5389-3, номер кузова (рамы) 0679394, цвет бежевый (инв. бух. № 01329дск) | 3 708,00 | 185,40 | 370,80 |
| 10 | Грузовой седельный тягач МАЗ – 6422 А5, 2008 г/в, регистрационный знак АВ 4860-3, номер кузова (рамы) – Y3M6422A580000276, цвет белый (инв. бух № 02464дск) | 1 320,00 | 66,00 | 132,00 |
| 11 | Полуприцеп бортовой МАЗ-938660 043, 2007 г/в, регистрационный знак А 1789 А-3, номер кузова (рамы) – Y3M 93866070008287 (инв. бух. № 02457дск) | 1 020,00 | 51,00 | 102,00 |
| 12 | Грузовой седельный тягач МАЗ 543205-220, 2007 г/в, регистрационный знак АВ 0149-3, номер кузова (рамы) – Y3M54320570002791, цвет белый (инв. бух № 02449дск) | 840,00 | 42,00 | 84,00 |

**Аукцион состоится 10 сентября 2019 года с 8.00 до 16.00 на электронной торговой площадке по адресу www.torgi.gov.by.**
Всю подробную информацию о лотах можно узнать на торговой площадке: **www.torgi.gov.by набрав в поиске, интересующий вас лот.**
Заявки на участие в электронных торгах в виде электронного документа направляются заявителями на электронный адрес, centr@economy.gov.by с даты настоящей публикации по **09.09.2019** в рабочие дни с 9.00 до 16.00.
Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, должно пройти регистрацию на электронной торговой площадке.
Заявитель вправе изменить или отозвать заявку не позднее дня окончания срока подачи заявок, направив организатору электронных торгов уведомление в виде электронного документа.
Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.
Продавец: ОАО «Светлогорский домостроительный комбинат».
Организатор аукциона: Управляющий ООО «Правовая Стратегия».
Задаток блокируется в момент первой ставки участника на лот. Участник может отозвать свою ставку (вернуть задаток) только если его ставка «перебита» другой более высокой ставкой другого участника. При этом информация о сделанной ставке такого участника остается в системе и сохраняется в протоколе торгов.
Задаток перечисляется на р/с Республиканского унитарного предприятия «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь» BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ» БИК: BELBBY2X УНП 190318109, ОКПО 37533622. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № личного кабинета). Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается по окончанию аукциона, в личный кабинет.
Победителем электронных торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.
Победителем электронных торгов в течение пяти дней со дня проведения электронных торгов возмещаются фактические затраты, связанные с их организацией и проведением, согласно прейскуранту находящегося по ссылке **https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx**
Победитель электронных торгов обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения электронных торгов.
В случае если на участие в электронных торгах подана только одна заявка или на электронных торгах не было объявлено ни одной ставки, организатор электронных торгов составляет протокол об объявлении электронных торгов несостоявшимися.
При наличии на электронных торгах только одной заявки организатор электронных торгов направляет по электронной почте единственному участнику предложение о приобретении предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, с указанием срока для возмещения затрат, связанных с организацией и проведением электронных торгов.
Ознакомиться с объектом аукциона можно в дни приема документов на участие в аукционе у продавца по адресу: Гомельская обл., Светлогорский р-н, г. Светлогорск, ул. Заводская, д.10. Контактное лицо для осмотра объектов: 8 (029) 961-69-20, 8 (02342) 5-85-23.
С правилами торгов можно ознакомиться по адресу: **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

Утерянный диплом на имя Лозицкой Юлии Владимировны УО «Белорусский государственный экономический университет», выданный в 2003 г. (номер диплома 0292697, регистрационный номер 04462), специальность «Финансы и кредит», считать недействительным.

УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 02.09.2019 г. по продаже имущества, изъятого у ООО «Спецавтотрансторг»
Грузовой пикап «Ниссан Навара», 2008 г. в., начальной стоимостью 9 500 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНП 190431606

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Лепш знізіць актыўнасць і плысці за вадой. Ёсць магчымасць на гэтым тыдні палепшыць адносіны з калегамі па рабоце. Паспрабуйце не планаваць нічога сур'ёзнага на сераду, гэты дзень пройдзе пад знакам легкадумнасці. У чацвер можаце разлічваць на падтрымку з боку начальства. У другой палове тыдня верагодны пэўныя неабгрунтаваныя прэтэнзіі ад блізкіх людзей.

**ЦЯЛЕЦ.** На гэтым тыдні збярыцеся з сіламі і змірыцеся з тым, што адбываецца. Змяніць сітуацыю вы пакуль не можаце. У аўторак нязробленыя справы і незадаволенасць начальства могуць ускладніць вам жыццё. У чацвер паспрабуйце не прымаць сур'ёзныя рашэнні, асабліва на эмоцыях. Каб пазбегнуць праблем у сямейным жыцці ў выхадныя, загадзя скажыце сабе, што іншы раз лепш прамаўчаць, а потым спакойна зрабіць па-свойму, чым сыпаць аргументамі і даказваць сваю правату.

**БЛІЗНЯТЫ.** З'явіцца рэальны шанц атрымаць менавіта тое, чаго вы моцна хочаце. І ў першую чаргу гэта датычыцца асабістага жыцця. Нават не давядзецца прыкладаць асаблівых намаганняў: самае лепшае здарыцца нечакана і будзе тым, што вам цяпер больш за ўсё трэба. Не выключана, што гаворка ідзе пра палкі любоўны раман, прапанову рукі і сэрца, папаўненне ў сям'і. Зрэшты, у дзелавой сферы ўсё таксама складваецца вельмі паспяхова.

**РАК.** Настройцеся на сур'ёзныя і рашучыя дзеянні, але ўлічыце, што безразважная рызыка можа пашкодзіць. Так што старанны аналіз сітуацыі проста неабходны. Калі будзеце рухацца ў дакладным кірунку, то навакольныя стануць ва ўсім падтрымліваць і справы пойдуць як па масле. У сераду можаце атрымаць добрыя весткі, будзе шанцаваць на прыемныя і карысныя знаёмствы. Да канца тыдня знікнуць практычна ўсе праблемы, якія не давалі спакою.

**ЛЕЎ.** Пажадана не адкладаць завяршэнне важных спраў на рабоце і нарэшце прыняць канчатковае рашэнне ў асабістым жыцці. Паспрабуйце рэальна ацэньваць свае магчымасці і не засмучацца ў выпадку магчымай няўдачы — проста выпраўце дапушчаныя памылкі, і абавязкова дасягнеце мэты. А вось ад авантурных планаў пажадана адмовіцца. Менш раздавайце абяцанняў, лепш больш спраў, а не слоў.

**ДЗЕВА.** Можа быць складана пераключацца з вырашэння сваіх праблем на праблемы навакольных. Не варта блытаць работу і сяброўства: можна лёгка застацца і без бізнесу, і без сяброў. У аўторак пастарайцеся не кантактаваць з людзьмі, якія не выклікаюць у вас сімпатыі. І наогул менш марнуйце час на пустую балбатню і сацыяльныя сеткі. У выхадныя не выключаны праблемы, звязаныя з падрастаючым пакаленнем.

**ШАЛІ.** Зможаце дасягнуць поспеху, хай прамежкавага, але ён акажацца не менш каштоўны, чым іншая буйная перамога. Вакол будзе шмат амбіцый і жаданняў пусціць пыл у вочы, але лепш проста шмат працаваць, каб даказаць сваю кампетэнтнасць. Праўда, у панядзелак пачуццё ляноты можа задушыць у вас усе іншыя жаданні, але ў другой палове тыдня сіл і энергіі значна прыбудзе. У пятніцу з'явіцца магчымасць выкарыстоўваць капрызы лёсу ў сваіх інтарэсах. А вось у выхадныя давядзецца сур'ёзна разбірацца з назапашанымі хатнімі справамі і сямейнымі праблемамі.

**СКАРПІЁН.** Можаце разлічваць на поспех на працягу практычна ўсяго тыдня, прычым у розных сферах жыцця. Надыходзіць час творчасці і высокай актыўнасці, асабліва ў інтэлектуальнай дзейнасці. Вас чакае салідны прыбытак. Але пастарайцеся, каб рабочыя пытанні не засланілі асабістае жыццё, яно таксама абяцае нямала задавальненняў.

**СТРАЛЕЦ.** Паспрабуйце сабрацца, бо менавіта цяпер вы зможаце вырашыць нават самыя, здавалася б, непераадольныя праблемы ў прафесійнай сферы. Калі, вядома, не будзеце марнаваць час і сілы на крытыку навакольных і жаль да сябе. Спытайце парады спецыяліста, перш чым пачаць увасабляць у жыццё новы план: не выключана, што вас засцерагуць ад памылкі. Пачатые ў нядзелю справы кідаць не варта, лепш давесці іх да пераможнага канца.

**КАЗЯРОГ.** На гэтым тыдні паспрабуйце выкінуць з галавы ўсё, што не спрыяе вашаму развіццю. Не чапляйцеся за старое, ад перамен, у тым ліку рэзкіх і нечаканых, вы толькі выйграеце. Тым прадстаўнікам знака, якія знаходзяцца ў адпачынку, зоркі рэкамендуюць актыўна забаўляцца, вандраваць і прымаць удзел у свецкім жыцці. Ну а для тых, хто працуе, традыцыйны падыход да вырашэння праблем можа аказацца няўдалым — магчыма, варта перагледзець свае погляды.

**ВАДАЛІЎ.** Пачуцці здабудуць глыбіню, а думкі — узвышанасць. Асабліва ўдалы гэты час для тых, каму ў рабоце неабходная Муза. Але нават калі гэта вас не датычыцца, ёсць імавернасць, што дзякуючы прыліву творчых сіл удасца знайсці нестандартнае рашэнне ў складанай справе, прыдумаць нешта арыгінальнае, што выкліча адабрэнне начальства. Час спрыяльны для прафесійнага росту. У нядзелю верагодныя сустрэчы з сябрамі, абмен вопытам і ўражаннямі.

**РЫБЫ.** Перад вамі могуць адкрыцца новыя магчымасці ў прафесійнай сферы. Не адмаўляйцеся ад заключэння здзелак і наладжвання патрэбных і карысных кантактаў. У пятніцу скіньце з плячэй груз адказнасці, дадайце легкадумнасці ў свае дзеянні, будзьце бесклапотныя, старайцеся менш больш зносін і не звяртайце ўвагі на нязначныя праблемы. У выхадныя магчымыя сустрэчы са старымі сябрамі або ранейшым каханнем. Падобна на тое, што давядзецца перагледзець свае кансерватыўныя звычкі і пастарацца прыстасавацца да зменлівай сітуацыі.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.36 | 20.53 | 15.17 |
| Віцебск — | 5.21 | 20.47 | 15.26 |
| Магілёў — | 5.26 | 20.43 | 15.17 |
| Гомель — | 5.29 | 20.34 | 15.05 |
| Гродна — | 5.52 | 21.07 | 15.15 |
| Брэст — | 5.59 | 21.02 | 15.03 |

### Месяц

*Першая квадра 7 жніўня. Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

**Пр.** *Анфісы, Марфы, Клімента, Мікалая, Навума.*
**К.** *Ірыны, Клары, Тэрэзы, Эдзіты, Рамана, Рамуальда.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 9 ЖНІЎНЯ




**1917** год — 102 гады таму ў Мінску выйшаў першы нумар газеты «Звязда». Сёння рэдакцыя выпусціла 29016-ы нумар.

**1944** год — у Мінску арганізаваны аўтазборачны завод (пазней на яго базе створаны Мінскі аўтамабільны завод — МАЗ).

**1984** год — адкрыўся Мінскі заапарк на вуліцы Ташкенцкай. Яго папярэднікам быў жывы куток, створаны раней з ініцыятывы работнікаў Мінскага аўтазавода, у якім знаходзілі прытулак жывёлы і птушкі, што трапілі ў бяду.




*Міжнародны дзень карэнных народаў свету. Упершыню ўстаноўлены Генеральнай Асамблеяй ААН у рамках абвяшчэння 9 жніўня 1994 года Міжнароднага Дзесяцігоддзя карэнных народаў свету. У свеце налічваецца каля 370 мільёнаў прадстаўнікоў карэнных народаў, якія жывуць у 90 краінах. Карэнныя народы з'яўляюцца носьбітамі ўнікальных культур, традыцый, атрыманых у спадчыну ад продкаў, і пераважнай большасці сусветных моў, агульная колькасць якіх складае прыблізна сем тысяч. Нягледзячы на ўсе культурныя адрозненні, перад карэннымі народамі планеты стаяць агульныя праблемы, звязаныя з абаронай уласных правоў як самабытных народаў.*

**1173** год — на Кафедральнай плошчы Пізы быў закладзены першы камень званіцы сабора Санта-Марыя Асунта, якая ўвайшла ў гісторыю пад назвай Пізанскай вежы. Будаўніцтвам званіцы займаліся майстры Гульельма з Інсбрука і Банана. Аднак, пабудаваўшы першы паверх вышынёй 11 метраў, Банана пабачыў, што званіца адхілілася ад вертыкалі на чатыры сантыметры. Майстар спыніў работу і пасляшаўся пакінуць горад. Час ад часу будаўніцтва аднаўлялі. Да 1233 года было пабудавана ўсяго чатыры паверхі. Толькі праз сто з лішнім гадоў пасля пачатку будаўніцтва, у 1275 годзе, гарадскія ўлады знайшлі новага архітэктара — Джавані дзі Сімоні, які рызыкнуў працягнуць узвядзенне званіцы. Да 1360 года будаўніцтва вежы нарэшце было завершана. Цяперашняя вышыня Пізанскай вежы — 56,7 метра, адхіленне верхавіны ад вертыкалі — каля 4,8 метра, і яно працягвае павялічвацца.



**З пяцідзесяцігоддзем сумеснага жыцця, з залатым вяселлем, шчыра віншуем сужэнцаў МАЗЖАРАВЫХ! Зычым вам, шаноўныя Валянціна Цімафееўна і Мікалай Васілевіч, моцнага здароўя, дабрабыту, увагі і павагі з боку блізкіх! А яшчэ — самых прыгожых кветак і шчодрых ураджаяў на вашай любімай дачы!**

**Звяздоўцы.**



## УСМІХНЕМСЯ

**— Што будзеш рабіць у адпачынку?**

**— А што, і ў адпачынку таксама трэба нешта рабіць?..**

Спіс важных спраў на сёння:

1. Не сёння.

Адзінае, што магло зламацца ў савецкай мясарубцы, — гэта стол, да якога яна мацавалася.

**— Пятровіч, ты можаш працаваць? Ужо выйшаў з запою?**

**— Я магу працаваць прама адтуль.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2787.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 жніўня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# Мясцовае Самакіраванне

9 жніўня 2019 г. № 32 (517)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Гарбузы і слімакі



Як ініцыятыўныя жыхары развіваюць сваё Новае Поле — вёску, што на Міншчыне. стар. 4

### Уздым з пераваротам



Што паспрыяла з'яўленню ў Светлагорску пляцоўкі для заняткаў варкаўтам? стар. 13

### Каб вады напіцца



У рамках Года малой радзімы на Віцебшчыне добраўпарадкавалі 15 крыніц. стар. 14

### «Сямейныя» дрэвы



На Гродзеншчыне вядзецца закладка алей у гонар важных сямейных падзей. стар. 15

### Свойскае малако



Колькі можна зарабіць на яго здачы за тры летнія месяцы? стар. 16


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ІНІЦЫЯТЫВА ВІТАЕЦЦА!

## Як ствараецца прыгожы ландшафт для камфортнага жыцця ў гарадах і сёлах

**Зрабіць мястэчкі Беларусі больш прывабнымі і зручнымі для жыцця і паказаць іх самабытную прыгажосць даволі проста — дастаткова мець жаданне добраўпарадкаваць двор і тэрыторыю вакол дома. А калі разам з запланаваным азеляненнем двароў, рамонтам дарог, стварэннем пляцовак для велапедаў і паркавак, установкай абсталявання для гульняў на дзіцячых пляцоўках і павелічэннем фінансавання зрабіць гэта ўсё яшчэ і арыгінальна... Нездарма штогадовыя конкурсы на найлепшы горад, двор і падворак, якія праводзяць камунальнікі, робіцца яшчэ больш актуальныя падчас Года малой радзімы, разлічанага на тры гады, і прыцягваюць да стварэння прыгажосці ўсё больш людзей. Ініцыятыва насельніцтва фактычна ўжо можа лічыцца трэцім кірункам работ па добраўпарадкаванні архітэктурных і ландшафтных аб'ектаў нароўні з іх утрыманнем і рамонтам за кошт бюджэтнага фінансавання, мяркуюць спецыялісты жыллёвай і будаўнічай гаспадаркі краіны, якія расказалі, што робіцца для добраўпарадкавання двароў нашых гарадоў.**

стар. 2

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ!

# ДОМ, ЯКІ ХОЧА ПАД ЗНОС

## Карэспандэнт «МС» высвятляла, як працуе Указ № 357 аб пустуючых і старых дамах, на прыкладзе Краснапольскага раёна. Ёсць праблемы

**Як вядома, гэты ўказ пашырае сваё дзеянне на ўсю тэрыторыю Беларусі, а не толькі на сяло, як гэта прадугледжваў Указ № 100 (летась ён страціў сілу). У новы ўказ перайшлі яго базавыя падыходы, якія даказалі сваю эфектыўнасць, пашырыліся магчымасці ўцягнення пустуючай і старой нерухомасці ў абарот, а заадно ўзмацніліся правы ўласнікаў на тое, каб яе захаваць. І гэта якраз і перашкаджае эфектыўнай рабоце, сведчаць спецыялісты.**

### Напрацоўваем базу

Спецыяльная камісія па абследаванні стану жылых дамоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Краснапольскага раёна, працуе з 19 снежня мінулага года. У яе склад уваходзяць прадстаўнікі райвыканкама, старшыні сельвыканкамаў, прадстаўнікі землеўпарадкавальнай службы, агенцтва па нерухомасці, міліцыі і гэтак далей — усе тыя, хто могуць выступаць экспертамі пры ацэнцы занядбанай нерухомасці.

— Рэестр па пустуючых дамах у раёне ўжо складзены, цяпер напрацоўваем рэестр старых дамоў, — кажа **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва і архітэктуры Краснапольскага райвыканкама Таццяна СМОЛКА.** — У гарадскім пасёлку іх не вельмі шмат, але вызначыць іх складаней, чым на вёсцы. Калі ў сельвыканкамах ёсць гаспадарчыя кнігі, ды і мясцовыя жыхары ведаюць, хто жыў у закінутых хатах і як знайсці іх нашчадкаў, то інфармацыю па дамах у самім райцэнтры трэба шукаць.

стар. 13

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Стаць бліжэй да ЕАЭС

**ЕС мог бы скарыстацца магчымасцямі Беларусі ў рабоце з іншымі краінамі Еўразійскага эканамічнага саюза. Такую прапанову агучыў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з кіраўніком прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Андрэа Віктарын, паведамляе БелТА.**

«Мы вядзём дастаткова самастойную палітыку, не пляцёмся ў хвасце рашэнняў, якія прымаюць іншыя дзяржавы, у нас ёсць уласная лінія паводзін. Лічу, гэта заслугоўвае пэўнай увагі», — сказаў кіраўнік верхняй палаты беларускага парламента.

Спікер падзякаваў Андрэа Віктарын за асабісты ўнёсак у развіццё беларуска-еўрапейскіх адносін. «Вельмі добра, што ў нас развіваецца дыялог, у тым ліку парламенцкі», — адзначыў ён. Разам з тым у Беларусі разлічваюць на вялікую падтрымку еўрапейскіх інстытутаў у двухбаковых міжпарламенцкіх кантактах з краінамі ЕС. У якасці прыкладу Міхаіл Мясніковіч прывёў Польшчу, Аўстрыю, Германію, Італію. «Але яны ўсе азіраюцца на пазіцыю Страсбурга і Бруселя. І ў гэтым плане, як мне ўяўляецца, можна было б «блаславіць» краіны Еўразійскага саюза на больш дынамічнае развіццё двухбаковых адносін з Беларуссю», — лічыць старшыня Савета Рэспублікі. «Мы не кажам пра нейкія саступкі і замоўчванні недахопаў. Мы кажам пра тое, што трэба збліжаць пазіцыі», — дадаў ён.

Акрамя таго, Міхаіл Мясніковіч адзначыў неабходнасць актывізацыі дыялогу на найвышэйшым і высокім узроўнях. «Ён патрабуе вельмі сур'ёзнага развіцця, — сказаў спікер. — Мне ўяўляецца, што рабіць гэта трэба крок за крокам, выкарыстоўваючы менавіта парламенцкае вымярэнне».

У сваю чаргу, Андрэа Віктарын звярнула ўвагу на вялікі прагрэс у беларуска-еўрапейскіх адносінах. Яна падтрымала думку старшыні Савета Рэспублікі пра важнасць міжпарламенцкіх кантактаў і неабходнасць іх развіцця.

# Плён супрацоўніцтва

**Беларусь разлічвае на пастаўкі машынабудаўнічай прадукцыі на індыйскі рынак, у першую чаргу кар'ерных самазвалаў БелАЗ, а таксама электробусаў.**



Фота БелТА.

Пра гэта заявіў старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з ганаровымі консуламі Беларусі ў Бангладэш, Індыі, Непале і Шры-Ланцы, паведамляе БелТА.

«Сёлета намячаецца больш высокі ўзровень таваразвароту, чым летась», — сказаў Міхаіл Мясніковіч, звяртаючыся да ганаровых консулаў у Мумбаі і Колкаце. Паводле яго слоў, з індыйскім бокам рэалізуецца дастаткова шмат праектаў, разам з тым, як падкрэсліў парламентарый, «Беларусь разлічвае на актыўнае ўваходжанне машынабудаўнічай прадукцыі на індыйскі рынак».

Рэалізаваны першы этап праекта па аднаўленні нафтавых свідравін на радовішчах Індыі. «Па наяўных у мяне звестках, індыйскі бок высока ацэньвае гэтую частку сумеснага праекта», — адзначыў старшыня Савета Рэспублікі.

Асобна Міхаіл Мясніковіч спыніўся на пытаннях супрацоўніцтва ў сферы фармацэўтычнай прамысловасці. Гаворка ідзе як пра закупку гатовых лекавых формаў і субстанцый, так і пра стварэнне сумесных кампаній па вытворчасці прэпаратаў.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыў добрыя адносіны, якія склаліся ў Беларусі з Бангладэш. «Мы рэалізавалі вялікі праект па дарожна-будаўнічай тэхніцы на больш чым 50 мільёнаў долараў. Цяпер у рабоце кантракт на 17 мільёнаў, прапрацоўваецца яшчэ адзін на 100 мільёнаў долараў. Гэта ўсё машынабудаванне», — сказаў ён. Беларускі бок стварыў адпаведныя сэрвісныя цэнтры, склады запасных частак, прапрацаваў пытанні падрыхтоўкі кадраў — механікаў і рамонтнікаў.

Міхаіл Мясніковіч таксама выказаў упэўненасць у развіцці прадуктыўных адносін Беларусі са Шры-Ланкай і Непалам.

Як адзначыў ганаровы консул Беларусі ў Бангладэш Анірудха Кумар Рой, вялікія перспектывы для сумеснага супрацоўніцтва дзвюх краін бачацца ў галіне сельскай гаспадаркі, яе механізацыі, а таксама адукацыі.

# ІНІЦЫЯТЫВА ВІТАЕЦЦА!

### Больш дрэў, менш кустоў

Будуць саджаць у гарадах у залежнасці ад памераў раслін, якія выкарыстоўваюцца пры азеляненні жылых тэрыторый, установ і арганізацый. Буйнапамерныя дрэвы цяпер павінны складаць у расліннным інтэр'еры больш за 20 %, раней — 5 %. Саджанцы сярэдняга памеру — 80 % супраць ранейшых 60 %. А ад маламерных раслін вырашана ўвогуле адмовіцца, хоць раней іх было 3 % у складзе саджанцаў пры азеляненні, расказала **Вольга ВЕРАМЕЙ, начальнік галоўнага ўпраўлення горадабудаўніцтва, праектнай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі:**

— Правілы добраўпарадкавання і ўтрымання гарадоў і населеных пунктаў скіраваны на стварэнне спрыяльных умоў жыццядзейнасці насельніцтва і фарміраванне экалагічнага, пажарабяспечнага і эстэтычна выразнага асяроддзя і належнага ўтрымання стану тэрыторый і прапісаны ў розных дакументах. Пастановай Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ад 25 ліпеня 2019 года № 43 прадугледжваецца ўнясенне змен у ТКП № 69 «Добраўпарадкаванне тэрыторый, азеляненне, правілы праектавання і ўладкавання» і ТКП № 295 «Будаўніцтва, праектная дакументацыя, склад і змест». Гэтымі дакументамі і прадугледжаны патрабаванні да колькасці саджанцаў дрэў.

Змены ў дакуменце абумоўлены тым, што дрэвы і кусты з маленькім дыяметрам ствала досыць складана прыжываюцца. Калі ж дыяметр дрэва сантыметраў дзесяць, і ў расліны сфарміравана карэнне, то ўжо адразу пасадкі будзе бачны завершаны выгляд твора ландшафтнай архітэктуры, які будзе сінтэзавацца з аб'ёмнай архітэктурай: будынкамі і збудаваннямі. А маленькія дрэвы змогуць «паказаць» ідэю архітэктара гадоў праз 20-30. Таму цяпер на жылых тэрыторыях будуць праектавацца і высаджвацца «дарослыя» дрэвы і кусты ў большым аб'ёме, дадала яна.

Падчас вясенняга месячніка ў сталіцы, напрыклад, было высаджана 31 345 дрэў, 74 567 кустоў і больш за мільён кветак, створаны 63 дэкаратыўныя кампазіцыі.

У дакументах таксама ўпершыню дадзена вызначэнне тэрміну «ландшафтная кампазіцыя» з указаннем складу яе элементаў.

— Да ландшафтнай кампазіцыі адносяцца: месцазнаходжанне, рэльеф, насаджэнні, вадаёмы, дарожная сетка, пакрыццё, паркавае звужэнне, малыя формы, — пералічыла Вольга Верамей. — Неабходна аддаць асаблівую ўвагу прынцыпам будавання ландшафтнай кампазіцыі, таму што яна стварае неабходны асяродак, вобраз і камфорт для жыцця.

### Грошы насельніцтва і бюджэту

Удзел насельніцтва ў добраўпарадкаванні можна вымяраць як фактычнай работай жыхароў, якую складана ацаніць, так і набыццём за іх сродкі нейкага абсталявання. Існуюць таксама і таварыствы ўласнікаў, якія самастойна добраўпарадкоўваюць сваю тэрыторыю, адлічваючы на гэта грошы па працягу года. Таму дакладна ацаніць, колькі сродкаў ідзе на ўладкаванне тэрыторыі з бюджэту і ад людзей, складана. Тым больш што ініцыятыва насельніцтва ў добраўпарадкаванні з кожным годам павялічваецца, упэўнены **Андрэй РАМАШКА, начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства ЖКГ:**

— Мясцовым органам улады даручана ажыццяўляць добраўпарадкаванне населеных пунктаў на конкурэнтнай аснове. Работа гэта вядзецца ў асноўным у двух кірунках. Найперш гэта ўтрыманне аб'ектаў добраўпарадкавання за кошт бюджэтных сродкаў. Другі кірунак — рамонт, у тым ліку падчас капрамонту. У межах стварэння аб'ектаў добраўпарадкавання і іх далейшага ўтрымання немалую ролю адыгрывае ініцыятыва насельніцтва, якая фактычна можа лічыцца трэцім кірункам работ па добраўпарадкаванні. Найбольш актыўна гэта працуе ў дробных населеных пунктах. Асобна адзначу ў гэтым плане Наваполацк, дзе актыўнасць праяўляецца і з боку жыхароў, і з боку ўлад.

Сёлета ўрадам вырашана павялічыць долю работ, якія выконваюцца па добраўпарадкаванні ў межах капрамонту, да 15 % замест існуючых 8 %. За кошт бюджэту летась работ па добраўпарадкаванні і санітарным утрыманні было выканана на чвэрць больш, чым у 2017-м. На гэта пайшло амаль 100 мільёнаў рублёў. Сёлета на добраўпарадкаванне прадугледжана яшчэ больш сродкаў, і тэндэнцыя да павелічэння фінансавання і работ працягнецца, дадаў прадстаўнік міністэрства:

— Конкурс на найлепшае добраўпарадкаванне і ўтрыманне населеных пунктаў, які праводзіць Мінжылкамгас, дазваляе кожнаму мястэчку не толькі ўпрыгожыцца і не страціць тэмп па развіцці, але і атрымаць грашовы прыз, які будзе скіраваны на далейшае добраўпарадкаванне пераможца.

### «Зялёны горад»

Каб далучыць мінчан да ўдзелу ў азеляненні прыдамавых тэрыторый, цэнтр інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама распрацаваў пілотны праект «Зялёны горад разам». Ён утрымлівае зялёную карту сталіцы, дзе з разбіўкай па раёнах нанесены ўчасткі для азелянення, на якіх можна прапанаваць сваю дапамогу. А ўжо ў гэтым месяцы пройдзе агляд-конкурс на найлепшае добраўпарадкаванне, санітарнае ўтрыманне і архітэктурна эстэтычны стан жыллёвага фонду ў намінацыях «найлепшы двор» і «найлепшы праект», паведаміла **Валянціна БАРКОЎСКАЯ, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі:**

— За першае паўгоддзе добраўпарадкавана 385 аб'ектаў з 635. Выканаты бягучы рамонт удасканаленага пакрыцця на плошчы больш за 132 тысячы квадратных метраў пры плане 141 тысяча. Адрамантаваны 54 вонкавыя лесвіцы, 119 кантэйнерных пляцовак, заменена і папраўлена 3448 кантэйнераў для збору цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА), 849 з якіх — для другасных матэрыяльных рэсурсаў. Адрамантавана таксама больш за 27 гектараў газонаў, 17,5 тысячы з існуючых 27 тысяч адзінак дзіцячага абсталявання для гульняў.

Сёлета запланавана выканаць капітальны рамонт 32 двароў, на 12 аб'ектах ужо распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя. Праектамі прадугледжана частковае перапразмеркаванне дваровай прасторы для ўладкавання агароджаных пляцовак і стварэння месцаў для захоўвання ровараў.

— На санітарнае ўтрыманне дваровых тэрыторый выдзелена больш за 28 мільёнаў рублёў, на добраўпарадкаванне аб'ектаў — больш за 10 мільёнаў. На добраўпарадкаванне дваровых тэрыторый падчас капрамонту — 3 мільёны 800 тысяч рублёў. Гэтых сродкаў было недастаткова, мы пастаянна прасілі дадатковае фінансаванне, — заўважыла Валянціна Баркоўская. — На ямачны рамонт, напрыклад, дадаткова было выдзелена больш за два мільёны рублёў. Налета грошай будзе патрэбна яшчэ больш, бо з'яўляюцца новабудоўлі, частка двароў і жылых дамоў, якія належаць таварыствам уласнікаў і жыллёва-будаўнічым кааператывам, пераходзіць на абслугоўванне камунальнымі службамі.

### Матываваныя здзіўляюць

Мінская вобласць таксама ўдзельнічае ў конкурсах ЖКГ. Больш за тое, Мінскі абласны саюз ветэранаў зацвердзіў палажэнне аб тым, каб з мінулага года праводзіць конкурсы па вызначэнні ў дварах вобласці найлепшага пад'езда і найлепшага прыватнага падворка, падзяліўся **Андрэй ШУЛЬГА, намеснік генеральнага дырэктара па камунальнай гаспадарцы ЖКГ Мінскай вобласці:**

— Людзі за ўласныя сродкі добраўпарадкоўваюць гэтыя месцы настолькі прыгожа, што здзіўляешся, на што здатныя жыхары, калі яны матываваныя. У буйных гарадах і населеных пунктах, якія маюць горадаўтваральныя прадпрыемствы, работа па добраўпарадкаванні тэрыторыі вядзецца з прыцягненнем спонсарскай дапамогі.

На ўладкаванне Мінскай вобласці сёлета затрачана ўжо 1 мільён 275 тысяч рублёў, і доля сродкаў на добраўпарадкаванне падчас капрамонту пры гэтым вагаецца ад 2 да 5 %. Падчас рэспубліканская суботніка прадпрыемствамі ЖКГ наведзены парадак у 1912 дварах. Адрамантавана 234 адзінкі спартыўнага і гульнявога абсталявання, заменены пясок у 243 пясочніцах, адрамантавана і заменена агародка на 34 пляцоўках, адрамантавана каля 22 дваравых прыбіральняў, каля 400 квадратных метраў пешаходных сцежак, устаноўлены 33 кантэйнерныя пляцоўкі для збору смецця і адрамантаваны 158.

Сёлета ў Барысаве, напрыклад, плануецца адрамантаваць да Дажынак 198 двароў з прыцягненнем сродкаў прадпрыемстваў. Тое ж адбываецца ў Жодзіне, Салігорску, Маладзечне. А па даручэнні Прэзідэнта пасёлак Чырвоная Слабада ў Салігорскім раёне і пасёлак Радашковічы ў Маладзечанскім вызначаны як аграгарадкі, якія неабходна ўладкаваць па прыкладзе пасёлка Копысь. Так што работа па добраўпарадкаванні адной вялікай радзімы праз упрыгожванне мноства малых працягваецца агульнымі намаганнямі дзяржавы, прадпрыемстваў і людзей.



**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

АКТУАЛЬНАЕ ІНТЭРВ'Ю

# Пётр НІКІЦЕНКА: «Я веру ў новую логіку стваральных паводзін чалавека»

**Год малой радзімы і будучыня Беларусі — тэма гутаркі карэспандэнта «МС» з Пятром Нікіценкам, вучоным і практыкам дзяржкіравання, акадэмікам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктарам эканамічных навук, прафесарам, экспертам Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН (ЕЭК ААН) па інавацыйным развіцці, стваральнікам беларускай міжнароднай навуковай школы інавацыйнага і наасфернага ўстойлівага развіцця.**

***— Пётр Георгіевіч, тэма Года малой радзімы перыядычна ўзнікае ў грамадстве ў розных аспектах. Звычайна агучваюцца падзеі і факты, якія датычацца зробленага, дасягнутага, пэўных планаў на найбліжэйшую перспектыву. Давайце паспрабуем зазірнуць значна далей, адштурхнуўшыся ад ідэй такога ёмістага паняцця, як малая радзіма, пагаварыць пра будучыню краіны ў шырокім сэнсе. Што б вы вылучылі найперш?***

— На маю думку, галоўнае, што мы можам і павінны «ўзяць» ад Года малой радзімы, дык гэта агульнымі намаганнямі сфарміраваць нацыянальную ідэю, якая аб'ядноўвала б усіх нас, дапамагла завяршыць стварэнне эканамічна моцнай, духоўна багатай, маральнай Беларусі, у якой рэалізацыя простых і зразумелых усім задач дасягнення годнай зарплаты і пенсійнага забеспячэння насельніцтва ў кожным населеным пункце краіны стала б моцным стымулам для эфектыўнай працы і далейшага разнявлення ініцыятывы нашых суграмадзян, выводу эканомікі на якасна новы ўзровень праз укараненне інавацыйных тэхналогій.

А для гэтага варта выкарыстаць патэнцыял кожнай тэрыторыі краіны. Заўважу, ён уяўляе сабой не толькі звыклыя нам прамысловасць, сельскую гаспадарку, фінансы, працоўныя рэсурсы і сродкі вытворчасці, але і прыродныя рэсурсы, інтэлектуальную ўласнасць, іншае нацыянальнае багацце. Беларусь, як вядома, багатая вадой: і мінеральнай, і чыстай пітной. І мы можам сёння толькі на кластары «Вада» забяспечыць дастаткова ўстойлівае развіццё эканомікі.

***— Карацей, вы бачыце рэзервы ў кардынальным абуджэнні магчымасцяў чалавека на яго ж карысць?***

— Так. Я не раз казаў і паўтаруся зноў: чалавек — гэта галоўная прадукцыйная сіла і носьбіт вытворчых адносін у любой сацыяльна-эканамічнай сістэме. Раней памылкова лічылася, што адукацыя, стварэнне інтэлектуальнага прадукту, мастацкіх твораў, выхаванне дзяцей, хатняя праца не з'яўляюцца прадукцыйнай катэгорыяй. Цяпер поспех развіцця эканомікі краіны, яе рэгіёнаў (там ёсць мясціны, якія мы называем малой радзімай) вызначаецца ўзроўнем і якасцю чалавечага розуму, светапоглядам, ідэалогіяй. Там, у рэгіёнах, наш галоўны рэсурс, прадукцыйная і натхняючая на справы сіла.

***— Але часам здаецца, што рэгіёны і цэнтр жывуць нібы кожны па сваіх небачных звонку правілах. А вы як лічыце?***

— Мы ўсе і даўно жывём ва ўзаемазалежным свеце. Кантыненты, вялікія і малыя краіны залежаць адно ад аднаго. І ў нашай краіне рэгіёны і цэнтр таксама ўзаемазалежныя. Ад іх партнёрства, а не



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

жорсткай падпарадкаванасці, адносін у рэжыме «загад-выкананне» будзе шмат у чым залежаць наш паступальны рух наперад.

***— А як рэгіёнам і цэнтру стаць паўнавартаснымі партнёрамі? Ці гатовая правінцыя да істотных перамен?***

— Неабходна новае мысленне. Прычым як у цэнтры, так і ў не меншай, а, можа, і ў большай ступені на месцах. Рэгіёны на клопаты цэнтра абавязкова адгукнуцца павышэннем эфектыўнасці дзейнасці ў розных сферах, у выніку цэнтр пры такой рэальнай падтрымцы знізу будзе больш паспяхова выконваць свае палітычныя, эканамічныя і адміністрацыйныя функцыі. Увогуле, у нашы дні думка становіцца галоўнай энергетычнай сілай. Праўда, не ўсе вераць у гэта. Пакуль. Але час на баку няўрымслівых, энергічных і прадпрымальных людзей, якія здолеюць грунтоўна пераасэнсаваць звыклыя рэчы, састарэлыя правілы, устойлівыя паняцці, адмовіцца ад стэрэатыпаў.

У гэтым сэнсе наасферная сацыяльна арыентаваная эканоміка (яна ўяўляе сабой новую логіку сацыяльна-эканамічных стваральных паводзін чалавека) можа выступіць у якасці платформы, ролі галоўнага фактара спалучэння інтарэсаў, мэт і задач рэгіёнаў і цэнтра. Наасфера, нагадаю, вывучае ўзаемадзеянне прыроды і грамадства, калі разумовая дзейнасць чалавека набывае вырашальнае значэнне на сучасным этапе развіцця. Наасферу многія вучоныя, у тым ліку і я, лічаць новай, вышэйшай стадыяй эвалюцыі грамадства.

Аднак чамусьці да наасферы ў нас яшчэ ставяцца як да нечага абстрактнага, эфемернага, далёкага ад рэальнай эканомікі, яна нібы знаходзіцца па-за дужкамі сучасных вытворчых адносін. А гэта не так, бо розум чалавека ў новых тэхналагічных умовах дасягае ўсё новых вышынь.

***— Напрыклад?***

— Прыкладаў шмат. Прыемна і радасна ўсведамляць, што маладыя талентамі багатыя па-ранейшаму і сталіца, і рэгіёны Беларусі. Яны далі нямала знакамітых у свеце IT-прадпрымальнікаў. Відаць, не выпадкова вядомая дзелавая амерыканская газета Wall Street journal назвала Беларусь «Сіліконавай далінай» Усходняй Еўропы. І гэта сапраўды так. Сёння ў Беларусі функцыянуе вялікі хаб распрацоўшчыкаў, прадукты і стартапы якіх знаходзяць прызнанне на міжнародным узроўні. Напрыклад, мабільная праграмай для жаночага здароўя FLO, у развіццё якога інвеставала мадэль з сусветнай вядомасцю Наталля Вадзянава, актыўна карыстаюцца больш за 28 мільёнаў чалавек. На слыху і гучныя здзелкі па набыцці беларускіх стартапаў. Так, напрыклад, карпарацыя Google набыла кампанію ў галіне штучнага інтэлекту AIMatter, Facebook набыў стартап MSQRD, а расійская кампанія Mail.ru — картаграфічны сэрвіс Maps.me. Я ужо не кажу пра дасягненні Парка высокіх тэхналогій у Мінску. Яшчэ доўга можна пералічваць.

***— Дарэчы, унёсак маладых у правядзенне ў Мінску Другіх еўрапейскіх гульняў таксама ўражвае. Наколькі я ведаю, падрыхтоўка знакавых спартыўных падзей для вас справа знаёмая. Ваша ацэнка арганізацыі Еўрапейскіх гульняў у нашай сталіцы?***

— Сапраўды, у свой час я меў непасрэднае дачыненне да XXII Алімпійскіх гульняў 1980 года ў Маскве. Я, тады кіраўнік Маскоўскага раёна Мінска, быў у ліку тых, хто адказваў за рэканструкцыю спартыўнай і гарадской інфраструктуры для правядзення футбольных матчаў у рамках Алімпіяды. Таму цяпер з цікавасцю сачыў за падрыхтоўкай і ходам II Еўрапейскіх гульняў. Яны прайшлі выдатна, што б ні казалі асобныя нядобразычліўцы, якія далей свайго носа не бачаць.

> Галоўнае, што мы можам і павінны «ўзяць» ад Года малой радзімы, дык гэта агульнымі намаганнямі сфарміраваць нацыянальную ідэю, якая аб'ядноўвала б усіх нас, дапамагла завяршыць стварэнне эканамічна моцнай, духоўна багатай, маральнай Беларусі.

Плюсы для Беларусі бясспрэчныя: значна палепшыўся імідж краіны ў свеце, рэканструявалі і адрамантавалі спартыўныя збудаванні, дарогі, на новы ўзровень узнялі сэрвіс, грамадскае харчаванне і г. д. Набыты досвед варта ўкараняць у рэгіёнах. Прыемна, што нямала выхадцаў адтуль, якія сталі пераможцамі і прызёрамі Другіх Еўрапейскіх гульняў, частку сваіх прызавых грашовых узнагароджанняў перадалі на ўмацаванне матэрыяльнай базы мясцовых спартыўных школ.

Увогуле, не толькі сталіца Беларусі, але і яе абласныя і нават некаторыя раённыя гарады ў недалёкай будучыні маюць усе шанцы стаць цэнтрамі правядзення еўрапейскіх і сусветных спартыўных спаборніцтваў. І гэта будзе дадатковы стымул для развіцця рэгіёнаў.

***— Чым яшчэ цэнтр можа рэальна і без асаблівых фінансавых выдаткаў (грошы ўсім заўсёды і ўсюды патрэбны) дапамагчы рэгіёнам?***

— Напрыклад, гарады і райцэнтры рэгіёнаў, нават пасёлкі і аграгарадкі могуць стаць пляцоўкай для дыялогу дзяржаўных структур і бізнес-супольнасці Беларусі па надзённых практычных пытаннях жыцця іх насельнікаў. Скажам, з мэтай дапамагчы наладзіць экспарт іх прадукцыі на тэрыторыі ЕАЭС і тым самым папоўніць мясцовыя бюджэты. Таму неабходны семінары, сустрэчы, пэўныя захады па стварэнні дзейсных інструментаў развіцця бізнесу і ўмацаванні канкурэнтаздольнасці беларускіх вытворцаў з глыбінкі. Напрыклад, актуальным з'яўляецца забеспячэнне прававых механізмаў абароны гандлёвых марак іх прадукцыі ў рамках ЕАЭС ад нядобрасумленных канкурэнтаў.

Нагадаю, сфера інтэлектуальнай уласнасці з'яўляецца прыярытэтнай для еўразійскай інтэграцыі. Таму трэба актыўна працаваць над уніфікацыяй заканадаўства, фарміраваннем цывілізаванага рынку інтэлектуальнай уласнасці на тэрыторыі ЕАЭС, арганізацыяй міжнароднага супрацоўніцтва і іншым. Гэта залежыць не толькі ад прыняцця адпаведных міжнародных дагавораў, але і ад ініцыятывы і паводзін усіх зацікаўленых бакоў, у тым ліку і беларускай бізнес-супольнасці.

***—А кадры для рэгіёнаў? Іх там часта не хапае.***

— Гэта асобнае і вялікае пытанне. Патрэбны не проста дыпламаваныя кадры, а спецыялісты з наасферным мысленнем. А для гэтага павінна хутчэй перабудоўвацца вышэйшая школа краіны. Трэба мець на ўвазе, што ў 90-я гады ў многіх постсавецкіх рэспубліках (праўда, у нас не ў такой вострай ступені) адбыўся разрыў паміж вышэйшай і прафесійнай адукацыяй. Ён і цяпер адчуваецца. Сёння відавочна, што многія неабходныя эканомікам рэгіёнаў спецыяльнасці не патрабуюць заканчэння ВНУ. Таму наспела патрэба рэарганізацыі ўсёй сістэмы адукацыі, яе максімальнага набліжэння да вытворчасці, іншай гаспадарчай дзейнасці. Пра гэта шмат гаворыцца і мала робіцца.

***— Чаму менавіта цяпер узнікла ідэя Года малой радзімы, а не 50—60 гадоў таму? Выпадкова, ці ў гэтым ёсць пэўная заканамернасць?***

— Мы 50—60 гадоў таму жылі толькі светлай будучыняй. Аж празмерна, нават хваравіта: пабудова камунізму, скарэнне цаліны, узвядзенне БАМа, марылі пра палёт на Марс і г. д. Жыццём сваіх продкаў мала цікавіліся, сямейныя генеалагічныя дрэвы не малявалі. Ды многім гэтага і не хацелася рабіць, бо сярод блізкіх сваякоў былі рэпрэсаваныя, вязні сталінскіх лагераў, так званыя «ворагі народа». Успамінамі пра іх можна было пашкодзіць кар'еры дзяцей. Ды і радзіма тады была адна на ўсіх: вялікі Савецкі Саюз. Пасля яго развалу сітуацыя змянілася, мы сталі іншыя, нас пацягнула да роднай гісторыі, традыцый, культуры, вывучэння менавіта сваёй малой радзімы. Мы ўвогуле засяродзіліся на стварэнні нацыянальнай беларускай дзяржавы. Вось так паступова і заканамерна прыйшлі да Года малой радзімы. Ён наўпрост звязаны з будучыняй краіны.

Я, напрыклад, ніколі не забываў пра роднія мясціны. У думках часта звяртаюся да сваей малой радзімы, дакладней Віцебшчыны. Я пастаянна адчуваю повязь з роднымі мясцінамі, нярэдка бачу ў снах Заходнюю Дзвіну, на беразе якой правёў шмат шчаслівых дзён, дзе бавіў вольны час з сябрамі, рыхтаваўся да школьных выпускных экзаменаў, паступлення ў ВНУ. Думкі пра малую радзіму натхняюць, даюць новыя сілы не толькі мне. Упэўнены.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

СІТУАЦЫЯ

# ЭХ, ДАРОГІ...

**«Ужо некалькі гадоў мы не можам дачакацца, калі заасфальтуюць дарогу Н-9824 Засулле — Бярозаўка — Коласава, неаднаразова звярталіся нават гэтага ў Стаўбцоўскі райвыканкам. Справа ў тым, што навокал знаходзіцца 48 дачных таварыстваў, у кожным з іх ад 70 да 400 участкаў. Калі ўлічыць мясцовыя вёскі, то на гэтай тэрыторыі пражываюць у летні перыяд каля 3000 чалавек. Гэта адзіная дарога, па якой можна даехаць да пунктаў прызначэння, збочыўшы з трасы М-1», — такі зварот са Стаўбцоўскага раёна атрымала рэдакцыя.**

Заяўнікі сцвярджаюць, што калісьці дарога была падрыхтаваная для ўкладкі цвёрдага пакрыцця. Пра гэта сведчыць пясчаная падушка. Але рукі дарожнікаў так і не дайшлі да справы.

Па словах дачнікаў, на гэтай дарозе заўсёды ажыўлены рух, курсіруюць маршрутныя таксі, аўтамабілі, аўтакрама, штодня тут ездзяць на веласіпедах школьнікі, бегаюць малыя дзеці. Разам з тым адсутнічаюць «ляжачыя паліцэйскія», абазначаныя пешаходныя пераходы, асвятленне, крытыя прыпынкі з лаўкамі. Толькі на ўездзе ўстаноўлены знак абмежавання хуткасці для аўтатранспарту. Таму аўтамабілі могуць разганяцца да 100 кіламетраў у гадзіну, што небяспечна для пешаходаў.

Старшыня аднаго з дачных таварыстваў неаднаразова звяртаўся ў Стаўбцоўскі райвыканкам наконт асфальтавання аўтамабільнай дарогі. Але кожны раз атрымліваў адказ у вуснай і пісьмовай форме, што пры спрыяльных умовах надвор'я дарожнікі прафілююць дарогу і будуць гэта рабіць і ў далейшым.

Яе сапраўды грэйдзіруюць і раўняюць. Аднак, як сцвярджаюць аўтары ліста, на ёй зноў і зноў з'яўляюцца няроўнасці, выбоіны. Грамадзяне лічаць, што бюджэтныя сродкі трацяць на латанне дарогі нерацыянальна. У сувязі з актыўным трафікам — па прыкладных падліках, да тысячы машын у тыдзень — дарога прыходзіць у ранейшы стан літаральна за некалькі дзён. Праблему можна вырашыць адзін раз і назаўсёды за кошт цвёрдага пакрыцця.

Як растлумачылі «МС» у камунальным унітарным прадпрыемстве «Мінскаблдарбуд», агульная працягласць дарогі Н-9824 Засулле — Бярозаўка — Коласава 8,25 кіламетра, у тым ліку 1,6 кіламетра заасфальтаваны, астатні адрэзак гравійны і стаіць на балансе КУП «Мінскаблдарбуд»-ДРБУ-135».

У краіне дзейнічае Дзяржаўная праграма па развіцці і ўтрыманні аўтамабільных дарог у Рэспубліцы Беларусь на 2017—2020 гады. Менавіта райвыканкамы фарміруюць спісы дарог на будаўніцтва, рэканструкцыю, капітальны і бягучы рамонт у рамках выluчаных на гэтыя мэты сродкаў. У першую чаргу бярэцца да ўвагі народнагаспадарчае і адміністрацыйнае значэнне мясцовых аўтамабільных дарог, іх эксплуатацыйны складнік. Згаданая вышэй дарога не ўключана ў пералік тых, якія патрабуюць правядзення першачарговых работ па асфальтаванні.

Членам дачных таварыстваў прапаноўвалася ўладкаваць дарогу шляхам прыватна-дзяржаўнага партнёрства з долевым удзелам. Такія прыклады ў Мінскай вобласці ёсць. Але людзі не пагадзіліся.

ІНІЦЫЯТЫВА

# ГАРБУЗЫ І СЛІМАКІ НОВАГА ПОЛЯ

## Што пад сілу сельскім актывістам

**Гісторыю можна вывучаць, а можна яе аднаўляць і працягваць, як актывісты з вёскі Новае Поле, што ў Мінскім раёне. А ў гэтага населенага пункта сапраўды цікавае мінулае.**



Маёнтак у розныя часы належаў розным знакамітым асобам: Агінскім, Сялявам. Апошнія яго гаспадары — князі Друцкія-Любяцкія, пры якіх тут жыло крыху больш за дзясятак чалавек. А сёння ў вёсцы налічваецца амаль тысяча жыхароў, і з кожным годам населены пункт прырастае навасёламі. Хтосьці купляе дом і пераязджае на лета з Мінска, а нехта — на пастаяннае месца жыхарства. Іншы атрымлівае ўчастак і будуе ўласнае жыллё. Аб'яднаць людзей розных узростаў, поглядаў, інтарэсаў у адну дружную сям'ю, грамадскую супольнасць імкнуцца актывісткі Любоў Ермакова і Дар'я Чыбуева. Менавіта ім належыць ініцыятыва зрабіць свой кут утульным, камфортным для жыцця культурным цэнтрам.

— Мы не згодныя з думкай, што ўдасканальвацца можна ў горадзе, а ў вёсцы толькі дэградаваць, — лічыць Любоў



У Новым Полі няма ні клуба, ні бібліятэкі. І гэтая хацінка стане цэнтрам адпачынку, творчасці, культуры, які аб'ядпае па інтарэсах людзей рознага ўзросту.

Ермакова. — Па сутнасці, гэта дыскрымінацыя па прыкмеце месца жыхарства. У сельскай мясцовасці людзі таксама маюць права на тое, каб культурна адпачываць, развіваць спадчыну, што засталася ад продкаў.

— Мы не маглі ў Год малой радзімы стаяць убаку ад агульнадзяржаўных задач і актыўна ўключыліся ў работу па зборы, апрацоўцы, сістэматызацыі гістарычных матэрыялаў. І на іх аснове ствараем пазнавальныя культурныя аб'екты, — уступае ў размову мастачка Дар'я Чыбуева. — Разам з жыхарамі распрацавалі лагатып вёскі, эскіз сцяга, за аснову ўзялі вежу сядзібы Друцкіх-Любяцкіх, з якой месцічы атаясамліваюць сваю вёску. У выніку сумеснай работы з'явіўся дызайн карты мястэчка, сабрана гістарычная інфармацыя, зарэгістраваны ўласны сайт і створаны старонкі ў сацыяльных сетках. І усё гэта за адзін толькі год! Але мы хочам як мага больш пашырана і дасканала прадставіць наша мінулае, расказаць пра таленавітых людзей, рамеснікаў, мясцовыя традыцыі, прадпрыемствы і арганізацыі.

Дар'я падводзіць нас да стэнда, які знаходзіцца ў гістарычным цэнтры вёскі.

— Каб паставіць яго, мы паўгода хадзілі па кабінетах. Аказалася, праблематычна. Адзін участак зямлі належыць сельскагаспадарчаму каледжу. Іншы — магазіну. Ледзьве знайшлі маленькі «нічыйны» пятачок. Стэнд будзе ўтрымліваць інфармацыю пра гэтую сядзібу, яе апошняга гаспадара Іераніма Друцкага-Любяцкога — надзвычай цікавага чалавека, які валодаў журналісцкім талентам, пісаў п'есы. Адну з іх мы планавалі паставіць на сцэне, якую збіраліся ўзводзіць. Але ж нашым марам не давялося здзейсніцца.

Справа ў тым, што актывісты расчысцілі стары парк, які ніхто ніколі не прыбіраў. Вывезлі не адзін прычэп смецця, часткова выраўнавалі тэрыторыю, а сельсавет абкасіў траву. Тут планавалася дзіцячая пляцоўка, але зрабіць яе не дазволілі, бо побач дарога: небяспечна для малых. Таму вырашылі паставіць крытую альтанку-сцэну, дзе меркавалася ставіць спектаклі, ладзіць культурна-забаўляльныя мерапрыемствы, выстаўкі, праводзіць паказ работ рамеснікаў, бо ў вёсцы ёсць свае народныя ўмельцы, мастакі. Грошы на яе ўзвядзенне вылучыў Фонд мясцовых супольнасцяў. Задумвалася, што сцэна будзе выкладзена 120 пліткамі і ўсе ахвотныя жыхары аздобяць іх каменьчыкамі і нават гербамі свайго роду, сям'і, калі такія ёсць. Але на ўзвядзенне аб'екта атрымаць дазвол не змаглі, бо ён лічыцца капітальнай канструкцыяй. На гэтым месцы правялі святы «Калядкі ў парку», «Гарбузы і слімакі Новага Поля». Зразумела, што гарбузы вырошчвае шмат хто ў вёсцы. А пры чым тут слімакі? Аказваецца, князі Друцкія-Любецкія трымалі цэлую ферму вінаградных слімакоў. І гэтыя бесхрыбетныя з таго часу жывуць тут і, больш таго, распаўсюдзіліся па ўсім наваколлі. Таму слімаковыя бягі сталі сапраўдным відовішчам і для малых, і для старых. У планах актывістаў выпечка здобных булак, якія формай нагадваюць слімака.

У самым разгары і работы па ўзвядзенні хаткі творчасці. З адводам зямлі пад яе было таксама шмат праблем. Дар'я Чыбуева дазволіла паставіць збудаванне на тэрыторыі, якая належыць яе сям'і, літаральна ў агародзе.



У Новым Полі няма ні клуба, ні бібліятэкі. І гэтая хацінка стане цэнтрам адпачынку, творчасці, культуры, які аб'ядпае па інтарэсах людзей рознага ўзросту. Актывісты тут плануюць ладзіць мастацкія выстаўкі, майстар-класы, «смачныя» вечарыны. Напрыклад, уладальнікі адной з аграсядзіб пякуць хлеб па старадаўніх рэцэптах, фірменную піцу. Яны ўжо праводзілі для землякоў бясплатную дэгустацыю. Ёсць людзі, якія вырабляюць сыры з казінага малака. Наогул у вёсцы шмат хто валодае рознымі відамі рамёстваў, якія перадалі продкі, і гатовы падзяліцца майстэрствам.

> Мы не маглі ў Год малой радзімы стаяць убаку ад агульнадзяржаўных задач і актыўна ўключыліся ў работу па зборы, апрацоўцы, сістэматызацыі гістарычных матэрыялаў. І на іх аснове ствараем пазнавальныя культурныя аб'екты.

Вядома, большая частка мясцовых жыхароў падтрымліваюць актывістаў. На іх баку і старшыня Гаранскага сельвыканкама Вольга Антоненка. Менавіта яна актыўна ўдзельнічае ў суботніках поплеч са сваімі землякамі, падтрымлівае іх намаганні. На жаль, знаходзяцца і тыя, хто супраць маладых задзірыстых хлопцаў і дзяўчат: маўляў, чаго ім больш за ўсіх трэба, навошта бударажыць ціхае вясковае жыццё?!

Тым не менш у вёсцы адчуваюцца перамены. На выездзе з населенага пункта паставілі папераджальны знак аб небяспечным павароце, уладкавалі праход да дзіцячага сада. Непасрэдна на агульных сходах жыхароў выяўляюцца праблемы, прымаюцца звароты ў розныя інстанцыі. Напрыклад, на адным такім народным вечы было прынятае рашэнне талакой узяцца за добраўпарадкаванне мястэчка. На яго нават запрашалі эксперта па сельскім развіцці. Пачаць вырашылі з выхавання культуры — культуры навядзення парадку на зямлі, быту, паводзін. А праблем сапраўды хапае: няма крытага прыпынку для транспарту, тратуараў або хоць адсыпаных бакавых дарожак — і гэта небяспечная сітуацыя. Вядома, не ўсё могуць зрабіць актывісты. У многіх пытаннях ім неабходна прафесійная дапамога. Разам з тым шмат што ім пад сілу, толькі б не ставілі бар'еры і не перашкаджалі.

**Матэрыялы падрыхтавала Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Тэлесеткі

# «Беларуская часінка» вяртаецца з канікул



Фота БТРК.

**Пачынаючы з 12 жніўня, вядучыя, мабыць, самай народнай тэлепраграмы «Беларуская часінка» зноў заступаюць на дзяжурства ў студыі і гатовыя дапамагаць суайчыннікам вырашаць камунальныя, спажывецкія, юрыдычныя і многія іншыя праблемы.**

Адна з вядучых праекта Саша Снегіна, якая пабывала гэтым летам на малой радзіме на Брэстчыне, прызналася, што нават там збірала ў месцічаў рэцэпты, як справіцца з той ці іншай складанай сітуацыяй. Пэўныя выклікі зрабілі самі сабе і іншыя вядучыя «Беларускай часінкі»: напрыклад, Алег Ціткоў другі раз пакарыў Карпаты, Канстанцін Юманаў натхніў 10-гадовага сына праехаць на веласіпедзе 42 кіламетры за тры гадзіны, а Уладзімір Богдан накруціў сотні кіламетраў на матацыкле, знаходзячы маршруты для новых серый праграмы «Я хачу гэта ўбачыць»... Апошнія дні расслабляюцца ў водпуску таксама Юлія Заўгародняя і Алена Спірыдовіч, якія запэўнілі, што гатовыя выйсці на работу і пачаць новы сезон «Беларускай часінкі» ў любы момант.

Нагадаем, па панядзелках вядучыя будуць разбіраць праблемы, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі Таварыства абароны правоў спажыўцоў і Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, па аўторках прымаюць званкі і гісторыі на «гарачую камунальную лінію» разам са спецыялістамі ЖКГ, а па серадах на пытанні адказвае вопытны адвакат Галіна Камароўская, якой дапамагаюць дадаткова па-за эфірам адвакаты Кацярына Ляўчук і Дзмітрый Праневіч. «Кожную серадy з 17 да 18 гадзін можна звярнуцца ў рэдакцыю праграмы на нумар 389-60-73, і нашы дзяжурныя адвакаты пракансультуюць ахвотных», — расказалі ствaральнікі праграмы.

Месца і час сустрэчы праграмы з гледачамі не зменіцца — з панядзелка да чацвярга а 17-й гадзіне.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 74

Наступную задачу склаў Мікалай Наруць з Лагойскага раёна *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Kpb7, Лf3, Лh2, Ca1, Ce8, Ka6, пe2 (7).

**Чорныя:** Kpa5, Ch1, Kg2, пп. c3, d4, f4, g5 (6).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru.

* * *

Беларускія зборныя прынялі ўдзел у камандным чэмпіянаце Еўропы сярод юнакоў і дзяўчат. Найлепшы вынік паказала наша юнацкая каманда да 18 гадоў — 4-е месца з 15 (за яе выступалі Вячаслаў Зарубіцкі, Вольга Бадэлька, Дзяніс Лазавік, Максім Царук, а лепш за іншых згуляў Іван Рунец — чаіыры перамогі, адзін пройгрыш, адна нічыя). Зборная хлопчыкаў да 12 гадоў фінішавала на 6-м месцы з 12, за яе гулялі Арцём Стрыбук (пяць перамог, адзін пройгрыш, адна нічыя), Міхей Навуменка, Арцём Бляяўскі і Іван Пятрэнка. У складзе дзявочай зборнай да 18 гадоў выступала 12-гадовая чэмпіёнка Беларусі сярод дарослых Саша Тарасенка (тры перамогі, два пройгрышы, адна нічыя), а таксама Ксенія Зелянцова і Арына Кузіч. Іх вынік — 12-е месца з 18.

* * *

На Мемарыяле Таля ў Рызе ў хуткіх шахматах (279 удзельнікаў) найлепшымі з 11 беларусаў былі Уладзіслаў Кавалёў (8-е месца) і Аляксей Аляксандраў (16-е), а ў бліцы (236 удзельнікаў) з 9 беларусаў вышэй у турнірнай табліцы сталі Валерый Казакоўскі (11-е месца), Уладзіслаў Кавалёў (16-е) і Аляксей Аляксандраў (30-е). У французскім Парцічыа Сяргей Жыгалка фінішаваў шаснаццаты з 87. У Шартры (Францыя, 42 гульцы) Сяргей Каспараў быў трэці, Таццяна Каспарава — дзевятнаццатая. На Мемарыяле Найдорфа ў Варшаве (132 удзельнікі) Аляксей Фёдараў заняў 9-е месца, Раман Грыб — 36-е.

* * *

Раней мы ўжо згадвалі вынікі міжнароднага турніру ў Сочы, дзе Кірыл Ступак заняў першае месца, а Аляксей Аляксандраў падзяліў трэцяе. Вось дзве перамогі нашых гросмайстраў у гэтым спаборніцтве.

Кірыл Ступак — Павец Коцур. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. Kf3 d5 4. Cg5 Cb4+ 5. Kbd2 0-0 6. e3 Kbd7 7. Фc2 h6 8. Ch4 c5 9. dc dc 10. c6 bc 11. C:c4 Ce7 12. 0-0 c5 13. Лfd1 Kd5 14. Cg3 Cb7 15. Ce2 Фc8 16. Kc4 Ca6 17. Лac1 Лd8 18. a3 Фb7 19. Лd2 Cb5 20. Лcd1 Фa6 21. Cf1 Лac8 22. e4 K5b6 23. Cd6 Cf6 24. K:b6 K:b6 25. C:b5 Ф:b5 26. e5 Cg5 27. K:g5 hg 28. Лd3 Фa4 29. Фe2 Kd5 30. Ce7 Лd7 31. C:g5 Kf4 32. C:f4 Л:d3 33. Л:d3 Ф:f4 34. g3 Фf5 35. Kpg2 c4 36. Лc3 Фb1 37. Фc2 Фa1 38. Фc1 Фa2 39. b3 Лc5 40. Л:c4 Л:e5 41. Лh4 f5 42. Фc8+ Kpf7 43. Фc7+ Kpf6 44. Лh7, 1:0.

Аляксей Аляксандраў — Ілие Марціновічы. 1. c4 f5 2. Kf3 Kf6 3. Kc3 e6 4. Фc2 d5 5. d4 c6 6. cd ed 7. Cf4 Ce7 8. e3 0-0 9. h3 Ke4 10. Cd3 Фa5 11. 0-0 Ce6 12. a3 K:c3 13. bc Фd8 14. Лfb1 b6 15. c4 dc 16. C:c4 C:c4 17. Ф:c4+ Фd5 18. Ф:d5+ cd 19. Ke5 g5 20. Ch2 Лc8 21. Лb5 C:a3 22. g4 Ce7 23. gf a5 24. Л:b6 a4 25. Лb7 Cd8 26. Kg4 Kc6 27. f6 h5 28. Kh6+ Kph8 29. Ce5 K:e5 30. de Лc7 31. Kf7+, 1:0.

* * *

Апублікаваны папярэднія вынікі індывідуальнага чэмпіянату свету па складанні шахматных кампазіцый за 2016—2018 гады. Беларускія складальнікі Віктар Волчак, Міхаіл Храмцэвіч і Валерый Ліскавец выступалі ў сямі раздзелах. М. Храмцэвіч заняў 8-е месца ў зваротных матах, 13-е ў двухходоўках. В. Волчак — трынаццаты ў трохходоўках і шматхадоўках.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Kf5! Першымі правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Васіль Жуковіч.

**Вадзім ЖЫЛКО.**



Сядзі і глядзі

# ДВАЦЦАЦЬ ПЯЦЬ. ПАЛЁТ НАРМАЛЬНЫ!

**На гэтым тыдні адзначае 25-гадовы юбілей Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія Рэспублікі Беларусь. І калі чвэрць стагоддзя таму ў беларускага тэлебачання была адна «кнопка» і адно праўдное радыё, то сёння ў структуры медыяхолдынга — сем тэлевізійных каналаў рознага кірунку, пяць радыёканалаў, пяць абласных тэлекампаній, афіцыйны партал www.tvr.by і асобныя сайты брэндаў, старонкі ў сацыяльных сетках, YouTube-каналы, а таксама спартыўны інтэрнэт-канал «Беларусь 5» і некалькі мабільных праграм, сярод якіх «Навіны АТН».**

Безумоўна, пазыўныя «Гаворыць Мінск!» у тэлевізійным эфіры прагучалі значна раней — Мінская тэлестудыя пачала працаваць яшчэ **1 студзеня 1956 года,** спачатку 2-3 гадзіны на суткі, паступова павялічваючы аб'ём. Гэтая дата лічыцца днём нараджэння беларускага тэлебачання, але да самастойнага і паўнавартаснага вяшчання яно дарасло значна пазней.

У 1962 годзе пачаўся абмен праграмамі з іншымі рэспублікамі Савецкага Саюза, а з 1974 года ў эфіры з'явіліся каляровыя тэлеперадачы ўласнай вытворчасці. У 1991 годзе Дзяржтэлерадыё БССР было перайменавана ў Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па тэлебачанні і радыёвяшчанні — і менавіта на яго базе ў жніўні 1994-га Указам Прэзідэнта была створана **Белтэлерадыёкампанія**. «Звязда» прапануе згадаць, што адбылося на Макаёнка, 9 за 25 гадоў.

З 1993-га кампанія стала паўнапраўным і адзіным у нашай краіне ўдзельнікам Еўрапейскага вяшчальнага саюза, што дало магчымасць абмену праграмамі ўжо не толькі з постсавецкімі, але і з еўрапейскімі краінамі. У прыватнасці, мы пачалі назіраць за **«Еўрабачаннем»**. Праўда, тады беларусы маглі «хварэць» хіба за суседзяў — Расію, Польшчу, Літву, бо дэбют нашых землякоў, дуэта «Аляксандра і Канстанцін», адбыўся толькі праз 10 гадоў.

20 гадоў таму, у 1999-м, выйшаў у эфір наш адказ лацінаамерыканскім мыльным операм — **першы нацыянальны тэлесерыял «Пракляты ўтульны дом»,** які зняў на «Беларусьфільме» рэжысёр Уладзімір Арлоў. Ці помніце — на працягу 34 серый у гістарычнай меладраме расказвалася гісторыя паненкі Саламеі і закаханых у яе ўдзельніка паўстання Кастуся Каліноўскага князя Юзэфа і паручніка царскай арміі Вясніцына...

Адзін за адным у структуры Белтэлерадыёкампаніі з'явіліся ўласныя каналы: галоўны інфармацыйны канал **«Беларусь 1»** (1992 год; да 2011-га насіў назвы «ТБК», «БТ», «Першы нацыянальны»), сямейна-забаўляльны «Беларусь 2» (2003; да 2011-га — «ЛАД»), спадарожнікавы «Беларусь 24» (2005; да 2013-га — «Беларусь-ТБ»). У 2006 годзе ў папулярнага расійскага федэральнага канала НТБ з'явілася ліцэнзаваная версія «НТБ-Беларусь». У 2013 годзе быў запушчаны сацыякультурны канал «Беларусь 3» і нацыянальны спартыўны «Беларусь 5», у 2015-м — рэгіянальны «Беларусь 4», самастойныя версіі якога выходзяць у 5 абласцях краіны на базе рэгіянальных тэлерадыёкампаній.

Сярод праграм медыяхолдынга хапае «доўгажыхароў», якія трымаюцца ў эфіры шмат сезонаў і нават гадоў: «Калыханка», «Беларуская часінка», «Тэлебарометр», «Добрай раніцы, Беларусь!», «Панарама»... Мабыць, рэч у асаблівай тэлевізійнай магіі?

— Безумоўна, яна існуе, — пагаджаецца **тэлевядучая Святлана ПАНКРАТАВА,** якую гледачы шмат гадоў ведаюць і любяць як «дзяжурную па надвор'і». — Асабіста я вельмі шчаслівая, што мы з тэлебачаннем знайшлі адно аднаго, што я амаль адразу трапіла ў сваю тэму, з якой працую ўжо шмат гадоў і не страчваю цікавасці. Спадзяюся, калі і пайду з эфіру, то хіба ў чарговы дэкрэт альбо на пенсію *(Смяецца)*.

***— Уявіце: вось ужо задзьмутыя 25 свечак на карпаратыўным торце... Што пажадаеце калегам на наступныя 25 гадоў і далей?***

— Каб яны рэалізоўвалі свае мары і раскрывалі напоўніцу таленты, якія ў іх ёсць. Каб не страчвалі працаздольнасці, імпэту і аптымізму. Магчымасцяў рэалізаваць сябе на сучасным тэлебачанні шмат — таму прыдумляйце тое, што цікава і карысна вам і гледачам!

Апошняе пажаданне, сцвярджаюць супрацоўнікі Белтэлерадыёкампаніі, яны ўжо выконваюць і рыхтуюць для сезона 2019/2020 шэраг новых арыгінальных праектаў.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# панядзелак, 12 жніўня



## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.40** «Зона Х» (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Забароненае каханне» (16+).**
**12.35, 13.05, 14.30, 15.25 Серыял «Прыгавор ідэальнай пары» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** «Нашы» (6+).
**22.05 Серыял «След» (16+).**
**0.20** «Арэна».
**1.05** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.40** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).**
**9.45** «Капейка ў капейку» (12+).
**10.15** «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
**11.05** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+)
**11.55** Анімацыйны фільм «Мегамозг» (12+).
**13.25 Камедыя «Як пазбавіцца ад хлопца за 10 дзён» (12+)**
**15.20 Драма «Ізгой» (12+).**
**17.45** «Веру — не веру» (16+).
**19.15** «Суперлато».
**20.40, 22.05** «Тата папаў» (16+).
**22.00** «Спортлато 6 з 49», КЕНО.
**22.30** «Хадзі сюды і танцуй».
22.35 Серыял «Жаночы доктар-2» (16+).
**23.25** «Трэці лішні» (16+) [СЦ].

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35** «Беларуская кухня». Цатні.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.20, 18.00 «Мімiно». Камедыя (12+) [СЦ].**
**10.55, 19.35** «Легенды кіно». Фрунзік Мкртчан (12+).
**11.35** «Навукаманія» (6+).
**12.25** «Наперад у мінулае».
**12.50, 22.30 «Вечны кліч». Маст. фільм. (12+) [СЦ].**
**14.00, 21.40 «Вольф Месінг. Ён бачыў скрозь час». Маст. фільм. (16+).**
**14.50, 21.05** «Танкі Другой сусветнай вайны». Фільм першы (12+).
**15.25** «Каб памяць зберагчы...» Песні беларускіх аўтараў у канцэрце да 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.
**17.10** «Люблю і памятаю». Народны артыст Беларусі Віктар Вуячыч.
**17.45** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).

## Беларусь 5

**6.40** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы. Суперліга. Дзень другі.
**10.40** Вялікі спорт.
**11.20** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
**12.05, 18.25, 1.45** Спорт-мікс.
**12.15** Пляжны валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Матч за 3-е месца.
**13.20** Пляжны валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Фінал.
**14.25** Тэніс. WTA. Таронта. Фінал.
**16.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Першы тур. «Ньюкасл» — «Арсенал».
**18.35** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — «Нёман» (Гродна). (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
**20.35** Хакей. Кубак Беларусі. «Нёман» (Гродна) — ХК «Гомель». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**22.45** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**23.45** Тэніс. WTA. Цынцынаці.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Контуры».
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.10 Серыял «Серафіма прыгожая» (16+).**
**12.05** «Модны прыгавор» (6+).
**13.10 Серыял «Ластаўчына гняздо» (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 0.00** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.25, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**18.55** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**21.10 Серыял «Экспрапрыятар» (16+).**
**23.05 Серыял «Бяссонніца» (16+).**

## СТБ

**5.30** «Вялікі горад».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.00, 12.25** «Вадзіць па-руску» (16+).
**9.25** «Тыдзень».
**10.40 «Разумнік». Серыял (16+).**
**12.40, 21.20, 23.40** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.40, 0.30** «Ежа багоў» (16+).
**15.40, 16.50 «Агент». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.05** «Глядзець усім!» (16+)
**23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**0.20** «Мінтранс» (16+).
**1.05** «Самая карысная праграма» (16+).

## МІР

**6.00 Серыял «Дом-фантом у пасаг» (16+).**
**8.20, 10.10 Серыял «Першае правіла каралевы» (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 2.50** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 1.20** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.05** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 0.55** «Такому мама не навучыць» (12+).
**17.15, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.40, 0.10, 3.40 Серыял «Закон і парадак» (16+).**
**5.15 Серыял «Кветка папараці» (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**8.45 Маст. фільм «Аддаленыя наступствы» (16+).**
**10.45** «Плюс мінус». Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.35** «Наша справа» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Серыял «Рая ведае ўсё!» (12+)**
**0.55 Серыял «Грошы» (12+).**

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Белавежская пушча (6+).
**6.25** «Рэальны свет» (12+).
**7.10, 8.05, 10.20 Серыял «Танцы марыянетак» (16+).**
**11.20 Серыял «Ляснік» (16+).**
**13.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00, 16.25 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**17.25, 19.50 Серыял «Павуцінне» (16+).**
**19.40** Сёння. Галоўнае.
**20.55 Серыял «Пёс» (16+).**
**22.50** «НЗ.by».
**23.15 Драма «Рэйдар» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 19.00, 21.05, 0.45** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.05** «Мультпарад». «Цімон і Пумба».
**7.30 Драма «Кіроўца для Веры» (16+).**
**9.20, 19.10 Серыял «Без тэрміну даўнасці» (16+).**
**10.25** «Belfashion.tv» (12+).
**11.25, 16.00** «Гумарынка».
**11.30 Трылер «Экіпаж» (6+).**
**13.40, 20.00 Серыял «Ранча» (16+).**
**14.25 Серыял «Застацца ў жывых» (16+).**
**16.30** Дак. серыял «Дарога ў школу. Палесціна».
**17.00 Фантастыка «Ціхаакіянскі рубеж» (12+).**
**19.05** «Рэальны бізнес».
**20.50** «Вечарынка» (0+).
**21.10 Драма «Мэры — каралева Шатландыі» (18+).**
**23.15 Серыял «Шэрлак» (12+).**

# нядзеля, 18 жніўня

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.20, 2.55** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**9.20** «Ералаш» (6+).
**9.50** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**10.10** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**10.45** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+)
**11.45** «Галерэя прыгажосці-2» (16+).
**12.20, 1.35** «Проста кухня» (16+).
**13.00, 2.05** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**14.00** Серыял «Псіхалагіні» (16+).
**15.00** Фэнтэзі «Жахі» (12+).
**17.00** Анімацыйны фільм «Воблачна, магчымыя ападкі ў выглядзе фрыкадэлек» (12+)
**18.40** «Уральскія пельмені» (16+).
**20.20** Фэнтэзі «Трус Пітэр» (6+).
**22.05** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**23.00** «Наш рамонт» (16+).
**23.45** Серыял «Лонданград» (16+).
**3.45** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**4.35** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** Чалавек перад Богам. «Таінства шлюбу».
**7.00** «Тры таўстуны». «Кентэрвільскі прывід». М/ф.
**8.00** «Канікулы Пятрова і Васечкіна. Звычайныя і неверагодныя». Маст. фільм.
**10.20** «Звычайны канцэрт».
**10.50** «Подзвіг разведчыка». Маст. фільм [СЦ].
**12.20** «Мой сярэбраны шар. Павел Кадачнікаў» [СЦ].
**13.10** «Стрэл у цемры». Маст. фільм.
**14.55** «Карамзін. Праверка часам». Дак. серыял.
**15.20** «Першыя ў свеце». Дак. серыял.
**15.35, 1.35** «Цуды горнай Партугаліі». Дак. фільм [СЦ].
**16.30** Да 85-годдзя з дня нараджэння Георгія Гараняна. «Пра час і пра сябе». Дак. фільм.
**17.10** Канцэрт Дзяржаўнага камернага аркестра джазавай музыкі імя А. Лундстрэма пад кіраваннем Георгія Гараняна.
**17.50** «Шукальнікі». «Золата атамана Перакаціполе» [СЦ].
**18.40** «Пешшу...» Масква Казакова [СЦ].
**19.10** «Муслім Магамаеў. Незададзеныя пытанні». Дак. фільм.
**19.55** «Муслім Магамаеў. Шлягеры XX стагоддзя».
**21.15** Да 85-годдзя П'ера Рышара. «Белая студыя».
**22.00** Другая цырымонія ўручэння Міжнароднай прафесійнай музычнай прэміі «BraVo» ў сферы класічнага мастацтва.
**0.35** «Дзяўчына спяшаецца на спатканне». Маст. фільм.
**2.30** «Арганаўты». «Цудоўны Гоша». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1977-ы. 2-я частка. 2009 год (12+).
**6.40, 7.45, 9.45, 10.55, 13.35, 14.35, 15.45, 16.55, 19.00, 20.35, 23.35, 0.50, 2.35, 3.45, 4.55** Музычная настальгія (12+).
**6.50** «Тэатральныя сустрэчы». «Непрыдуманыя гісторыі. Забаўны выпадак». 1992 год (12+).
**8.05** Кінаканцэрт «Вам песня прысвячаецца, або Зноў карнавальная ноч». 1983 год (12+).
**9.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 18.05, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** Маст. фільм «Волга-Волга» (12+).
**13.50** «Мы Вас любім!» Канцэрт гурта «Воскресение». 1994 год (12+).
**15.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**16.00** Канцэрт «Машина времени» і гурта «Цветы». 2010 год (12+).
**17.05** «Галіна Вішнеўская ў «Астанкіна». Фільм-канцэрт. 1993 год (12+).
**19.10** «Вакол смеху». «Інстытут гумару» — «Дзень адчыненых дзвярэй». 1982 год (12+).
**21.00** «Мільянерка». Фільм-спектакль. 1974 год (16+).
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім: «Гісторыя рускага рока». Гурт «Николай Коперник» і гурт «Ночной проспект». 2006 год (16+).
**1.40** Маст. фільм «Усміхніся суседу» (12+).

## EuroSport 1

**0.00** Ралі. ERC.
**0.35, 8.00** Снукер. International Championship. Фінал.
**2.30, 6.30** Лёгкая атлетыка. Камандны чэмпіянат Еўропы.
**4.00, 12.00, 18.00** Веласпорт. «Арктычная гонка Нарвегіі».
**4.30, 9.30, 21.35** Веласпорт. «Тур Юты».
**5.30, 10.30, 16.00** Веласпорт. Binckbank tour.
**12.30, 20.00** Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
**13.00** Трыятлон. Алімпійская кваліфікацыя.
**14.00, 19.15** Веласпорт. Сусветны тур.
**20.30** Алімпійскія гульні. Camps to Champs.
**21.00** Алімпійскія гульні. «Сіла асобы».

## Кінакамедыя

**0.35** Няўдачлівыя (16+).
**2.55** Любоў-маркоў па-французску (18+).
**4.55** Бабло (16+).
**6.45** Прывітанне, Біл! (18+)
**8.40** Неверагодныя прыгоды Факіра (16+).
**10.25** Ушчэнт (16+).
**12.15** Вельмі страшнае кіно (16+).
**13.50** Вельмі страшнае кіно-2 (16+).
**15.25** Вельмі страшнае кіно-3 (16+).
**17.00** Дзюплекс (12+).
**18.40** Superперцы (16+).
**20.50** З 13 у 30 (12+).
**22.40** Ура! Канікулы! (6+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**8.05** Калекцыя «Беларусьфільма». «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм (12+).
**10.25** «Заўтра сёння» (12+).
**10.55** «Выратуйце, я не ўмею гатаваць!» (12+)
**11.45, 2.15** «Рабінзон». Серыял (16+).
**15.30** «Ён і яна» (16+).
**16.55** «Тэрмін даўнасці». Маст. фільм (16+).
**20.30** «Без падману» (16+).
**21.25** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**22.00** «Гангстар». Драма (18+).
**0.50** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**5.30** «Нераскрытыя тайны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 18.15** Людзі ў чорным (12+).
**8.25** Сацыяльная сетка (16+).
**11.00** Бойфрэнд з будучыні (16+).
**13.15** Піяніст (16+).
**16.00** Трыстан і Ізольда (12+).
**20.10** Непрыстойныя танцы-2: гаванскія ночы (16+).
**21.45** Асцярожна, дзверы зачыняюцца! (16+)
**23.35** Свецкае жыццё (18+).
**1.25** Каханне і страсць. Даліда (18+).
**3.50** Легенда Зора (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Тэлі і Толі (12+).
**8.05** Чэмпіёны: хутчэй, вышэй, мацней (6+).
**10.00** Канікулы прэзідэнта (16+).
**11.50** Палёты ў сне і наяве (6+).
**13.30** Выратаваць Ленінград (12+).
**15.20** Кіліманджара (16+).
**16.45** Без межаў (12+).
**18.30** Аднакласнікі.ru: наCLICKай удачу (12+).
**20.20** Населены востраў (12+).
**22.35** Чорная вада (16+).
**0.40** Нягоднік (16+).
**2.30** Яраслаў. Тысячу гадоў таму (16+).
**4.15** Тэсты для сапраўдных мужчын (16+).
**5.30** Чорная вада (16+).

## National Geographic

**6.00** Навукова недарэчнасці (16+).
**6.25** Цуды інжынерыі (16+).
**7.15, 1.05** Інстынкт выжывання (16+).
**8.05, 12.00** Суперкар са сметніка (16+).
**8.50** Золата ў халоднай вадзе (16+).
**9.40** Каралі рыбалкі (16+).
**10.25, 5.35** Код небяспекі (16+).
**11.15, 5.10** Гульні розуму (16+).
**12.50** Аўта-SOS (16+).
**14.20** Дзённікі круізнага лайнера (16+).
**15.55** Унутры неверагоднай механікі (16+).
**16.45** Нарка Блінг: злавіць Чапа Гусмана (16+).
**17.25** Фідэль Кастра: страчаныя плёнкі (16+).
**18.10, 3.30** Генуя: храналогія катастрофы (16+).
**19.00, 22.05, 2.40** Асушыць акіян (16+).
**19.45** Шандун: краіна Канфуцыя (16+).
**20.30** У пагоні за спадчыны (16+).
**22.50** Служба бяспекі аэрапорта (16+).
**4.20** Невядомая планета Зямля (16+).

## Discovery

**8.00, 9.20, 18.30** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25, 17.35** Як гэта ўстроена? (12+)
**10.15** Склады (16+).
**11.10** Смяротны ўлоў (16+).
**12.05** Аўтабан А2 (12+).
**13.00, 23.05** Скарбы карыбскіх піратаў (12+).
**13.55, 22.10** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**14.50, 1.50** Голыя і напалоханыя (16+).
**15.45, 3.40** Ратавальнікі маёмасці (12+).
**19.25** Лабараторыя выбуховых ідэй (16+).
**0.00, 7.10** Не спрабуйце паўтарыць (16+).
**0.55** Самыя хуткія машыны Поўдня (12+).
**2.45** Экстрэмальныя фургоны (12+).
**5.30** У пагоні за класікай (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.*

# ДОМ, ЯКІ ХОЧА ПАД ЗНОС



Першы намеснік старшыні райвыканкама, старшыня раённай камісіі па абследаванні стану жылых дамоў Валерый НАСКО знаёміцца з дакументацыяй на пустуючыя дамы.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Каб выйсці на спадчыннікаў, робім запыты ў розныя службы і не заўсёды знаходзім патрэбную інфармацыю. Па кожным доме збіраем вялікія пакеты дакументаў. Плануем сёлета прыняць рашэнне прыкладна па васьмі краснапольскіх дамах такой катэгорыі. Спадзяёмся, што налета мы іх знясём.

Сёлета асноўная нагрузка па выкананні 357-га ўказа лягла на сельвыканкамы. І, як сведчаць спецыялісты, новыя правілы адбіліся на тэрмінах.

— Работа ідзе, але вельмі марудна, — канстатуе Тацццяна Міхайлаўна. — Па 100-м указе са старымі дамамі сельвыканкаму прасцей працавалася, бо не трэба было звяртацца ў суд. Дамаўляліся на ўзроўні ўласніка і па рашэнні сельвыканкама зносілі. Цяпер працэдура ўскладнілася. Трэба абавязкова прайсці праз суд, прыняць безгаспадарчую нерухомасць ва ўласнасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі і далей дзейнічаць у адпаведнасці з заканадаўствам.

## З судоў не вылазім

На сайце райвыканкама ёсць рэестр пустуючых дамоў. Усе яны знаходзяцца ў Яноўскім сельсавеце. Едзем на месца знаёміцца з сітуацыяй.

На 1 студзеня на тэрыторыі гэтага сельсавета налічвалася 13 старых дамоў і 21 пустуючы. У лютым раённая камісія абследавала восем з іх і зрабіла пяць заключэнняў. Тры дамы выпалі са спіса, бо не прайшло трох гадоў з таго моманту, як яны засталіся без гаспадара. У рэестр пустуючых трапілі чатыры дамы, па трох з іх справы разглядаюцца ў судзе.

**Старшыня сельсавета Наталля ЛАГУЦІНА** дэманструе адну з пустуючых хат у вёсцы Палуж-1.

— Гэта дом, з якім мы працавалі яшчэ па сотым указе, — кажа яна. — Тут ніхто не зарэгістраваны і не пражывае працяглы час. Уласнік знаходзіцца ў Навагрудку. У адпаведнасці з 357-м указам мы правялі ўсю неабходную работу, каб прызнаць яго пустуючым. Дом быў агледжаны раённай камісіяй, яму далі ацэнку і ўнеслі ў рэестр. Усё гэта заняло шмат часу па працягласці, але без гэтага справу не сталі б і разглядаць у судзе. Мы спадзяваліся, што суд на падставе гэтых дакументаў перадасць яго ў нашу ўласнасць для далейшага прыняцця рашэння аб зносе. Але ўласнік напісаў у суд ліст, што будзе рамантаваць сваю закінутую хату і жыць у ёй. Чакаем рашэння суда, але вельмі вялікая імавернасць, што яно будзе не на нашу карысць.

Дэпутат кажа, што дом доўгі час стаяў без нагляду і ўласніку да яго не было ніякай справы. Яна ўпэўнена, што ён не прымецца яго акультурваць і цяпер, проста цягне час. Але прыватная ўласнасць ахоўваецца законам і тут нічога не зробіш.

— Падыходы змяніліся, і нам стала цяжэй працаваць, — кажа суразмоўца. — Па новым указе пад пустуючыя дамы трапляе дом, дзе ўчастак не апрацоўваецца, тэрыторыя зарастае, і факт непражывання відавочны. І не мае розніцы, зарэгістраваны тут нехта або не. А ў сотым указе пад пустуючыя дамы траплялі толькі тыя, дзе не былі зарэгістраваныя людзі. Калі ўласнік нам даваў пісьмовы дазвол на знос дома, мы на яго падставе прымалі рашэнне і зносілі. Цяпер мы вырашаем такія справы толькі праз суд. Мы правялі вялікую работу — абследавалі, зрабілі заключэнне, але суд нам адмовіў, таму што на апошнім этапе грамадзянін сказаў: я перадумаў, буду там жыць. І ўсё застаецца па-ранейшаму. Дадалося больш пісаніны, шмат часу адымае хаджэнне па судах. Бо адным слуханнем справа не заканчваецца. Па трох дамах, якія цяпер разглядаюцца, іх адбылося ўжо шэсць. Вось нядаўна было пасяджэнне па яшчэ адным доме ў Палужы. Уласнік даслаў ліст у суд з дазволам разглядаць справу без яго ўдзелу і зносіць дом. Суддзя ж сказаў, што справу накіруюць па месцы знаходжання ўласніка, там яго дапытаюць у судзе і высветляць, ці ёсць у яго родныя, а раптам яны пажадаюць уступіць у спадчыннасць. І ўся работа, якую мы зрабілі, становіцца бессэнсоўнай. Адзінае, што мы атрымліваем, гэта магчымасць выпісаць прадпісанне або скласці пратакол. Калі грамадзянін праігнаруе, да яго будуць прымацца адміністрацыйныя меры.

**Анжаліка ГОМАН, старшыня Краснапольскага райсавета:**

— Цяпер мы актыўна працуем па закінутым жыллі. Праводзіцца складаная, карпатлівая работа, робіцца шмат тэхнічнай дакументацыі. Аддзел жыллёва-камунальнай гаспадаркі, будаўніцтва і архітэктуры райвыканкама рассылае паведамленні спадчыннікам, чакае інфармацыю ад іх. Без гэтага нельга ўключыць гэтыя дамы ў рэестр пустуючых. Пакуль у рэестры ніводнага дома па Краснапольлі няма.

Што датычыцца сяла, то там новы ўказ дадаў цяжкасцяў. Раней мы працавалі на ўзроўні ўласнікаў — яны адмаўляліся ад дома, і мы яго зносілі. Цяпер усё робіцца толькі праз суд. У Яноўскім сельсавеце ёсць дом, які стаіць ужо без даху, але па рашэнні суда іск адхілены. Спадчыннікі паабяцалі, што яго адновяць. Атрымалася замкнёнае кола. Мы ж ведаем, што агенцтва па нерухомасці не стане рэгістраваць гэтае незразумелае збудаванне, пакуль яно не будзе адпавядаць статусу жылога дома. І я падазраю, што хутка мы зноў вернемся да яго. Між тым усе разумеюць, што знос старых дамоў па-ранейшаму звязаны з навядзеннем парадку на зямлі. Райаддзел па НС піша прадпісанні, каб працавалі з кінутымі дамамі, маўляў, не пакошана, пабудова аварыйная, а гэта небяспечна для людзей. Суседзі скардзяцца, што дом псуе пейзаж. А ў нас рукі як звязаныя.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара,**
*г. п. Краснаполле.*



Наталля ЛАГУЦІНА каля дома, які суд не пажадаў прызнаць пустуючым.

# УЗДЫМ З ПЕРАВАРОТАМ? ЛЁГКА!

**СЁННЯ пляцоўка для заняткаў вулічнай гімнастыкай у Светлагорску — месца, любімае як падлеткамі, так і звычайнымі адпачывальнікамі. Зусім побач знаходзіцца ўладкаваная тэрыторыя, дзе могуць адпачыць матулі з зусім маленькімі дзеткамі. Тут жа і галоўны гандлёвы цэнтр горада, пакупнікі якога часцяком затрымліваюцца ў міні-парку.**

А яшчэ пяць гадоў таму ў горадзе ўвогуле не было парка для адпачынку. І, як кажуць чыноўнікі райвыканкама, жыхары проста засыпалі іх скаргамі пра тое, што няма дзе правесці вольны час.

Дарэчы, варкаўт у Светлагорску пачаў развівацца каля дзесяці гадоў таму. Аматарам спорту тады даводзілася займацца гімнастыкай на старых стадыёнах і ў дварах. Маладыя светлагорцы пачалі ездзіць на спаборніцтвы, здымаць відэаролікі пра свой рух і выходзіць да гарадскіх улад з просьбамі ўсталяваць прафесійную пляцоўку. Гэтыя звароты тады ператварыліся ў наказ выбаршчыкаў Галіне Філіповіч, неўзабаве выбранай дэпутатам Палаты представаўнікоў ад Светлагорскай акругі № 46.



Спатрэбіліся намаганні не толькі ўлад, хоць менавіта яны зрабілі першы ўнёсак у справу ўладкавання тэрыторыі на перакрыжаванні вуліц Свярдлова і Калініна. Потым прыцягваліся грошы, зробленыя на суботніках. Выкарыстаны былі і сродкі па праграме міжнароднай тэхнічнай дапамогі.

Вось такім чынам у 2015 годзе да Дня горада была адкрыта пляцоўка для варкаўта. Між іншым цяпер яна выкарыстоўваецца і для правядзення фестывалю вулічных субкультур «Лайфстрыт» і для іншых шматлікіх спаборніцтваў: па падцягванні на перакладзіне, адцісканнях на брусах і так званым фрыстайле — сілавых практыкаваннях на брусах і турніку.

Цяпер дзеці, якія займаюцца тут, аб'яднаны ў нефармальную групу вулічнай гімнастыкі. Грамадскае аб'яднанне курыруе аддзел спорту і турызму. Пляцоўка знаходзіцца на балансе спартыўнай школы № 2. Ёсць інструктар-метадыст, які дапамагае юным фізкультурнікам.

Галоўнае, што відавочна: пляцоўка карыстаецца попытам. Тут заўсёды многа дзяцей. Не ўсе адразу адважваюцца зрабіць складаныя спартыўныя практыкаванні, але ж многія спрабуюць. Азарт, з якім займаюцца хлопчыкі, натхняе многіх. Дарэчы, і выразная мускулатура таксама. Так з гледачоў некаторыя паступова пераходзяць у заўзятых прыхільнікаў. Таму ж спрыяюць і спартыўныя мерапрыемствы, якія тут пастаянна праводзяцца. **Намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Светлагорскага райвыканкама Марына ГРАЮШАВА** расказвае, што ўлады ўважліва адносяцца да ініцыятыў школьнікаў:

— Дзеці прапанавалі правядзенне чэмпіянату па вулічным баскетболе. Праводзіцца ў нас таксама чэмпіянат па аўтагуку і спаборніцтвы для экстрэмалаў на пазадарожніках. Спартыўная пляцоўка для ролераў і скейтбардыстаў была зроблена на набярэжнай Бярэзіны. Ініцыятыва зыходзіла не ад аднаго гараджаніна — заявы ў райвыканкам пісалі і бацькі, і самі спартсмены. Дзеці намалявалі схему і перадалі яе інжынерам мясцовага завода жалезабетонных вырабаў і канструкцый. У выніку пляцоўка атрымалася вельмі папулярная і запатрабаваная сярод людзей розных узростаў. Уся наша работа пабудавана такім чынам, каб любы ініцыятыўны чалавек знайшоў сваё месца і магчымасць увасаблення ідэй.

У Светлагорску, дарэчы, ёсць грамадская арганізацыя «Рэальны свет». Маладыя людзі, якія ў яе ўваходзяць, ужо рэалізавалі некалькі цікавых праектаў пры садзейнічанні міжнародных праграм. «Я такі ж, як ты» — прысвечаны развіццю творчага патэнцыялу ў дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Ініцыятыва «Дзеці — дзецям» была ажыццёўлена ў партнёрстве з Васілевіцкім домам-інтэрнатам. Падлеткі зрабілі аўдыязапіс кніг для дзяцей, якія дрэнна бачаць. Трэцяя ініцыятыва — «Дваровыя перавароты». Валанцёры падкрэсліваюць, што вельмі дзейсны спосаб навучання, калі падлеткі вучаць сваіх равеснікаў. А **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Галіна ФІЛІПОВІЧ** адзначае, што грамадскія арганізацыі ў Светлагорску ажыццяўляюць свае ініцыятывы разам з органамі мясцовай улады:

— Добра, што не засталіся ўбаку грамадскія арганізацыі і далучыліся да ідэі ўладкавання паркавай зоны. Дзякуючы гэтаму тут з'явіліся новыя пляцоўкі для адпачынку маладых сем'яў з дзецьмі. Важна прыцягваць насельніцтва да рашэння такіх праблем. Гэта дапамагае аб'яднаць намаганні. Цяпер ідуць пазітыўныя водгукі, але ж жыццё не стаіць на месцы, і жыхары горада задаюць пытанні наконт далейшага развіцця і добраўпарадкавання тэрыторый. Будзем разам шукаць магчымасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**



ДОБРЫ ПРЫКЛАД

# Каб вады з крыніцы напіцца

**Сёлета ў Віцебскай вобласці ў рамках мерапрыемстваў Года малой радзімы добраўпарадкавалі пятнаццаць крыніц. Навялі прыгажосць у Глыбоцкім, Гарадоцкім, Докшыцкім, Дубровенскім, Мёрскім, Аршанскім, Полацкім, Пастаўскім, Сенненскім, Лёзненскім раёнах. Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, прадстаўнічыя органы ўлады вельмі актыўна дзейнічаюць у гэтым кірунку.**

Днямі ў карпункт патэлефанавалі з глыбінкі. Лёзненскі сельскі выканкам дапамог тутэйшым з вёскі Смародзіна рэалізаваць іх «крынічную» мару: правялі абрад асвячэння крыніцы, арганізавалі і правялі свята населенага пункта.

Па-ранейшаму на слыху ўсё, што робіцца ў Аршанскім раёне. Там таксама добраўпарадкавалі дзве крыніцы. Адна з іх — на тэрыторыі Копыскага лясніцтва — справа рук супрацоўнікаў лясгаса. А ў вёсцы Барадзіно пад кіраўніцтвам святара ў рабоце ўдзельнічалі мясцовыя жыхары. Акрамя гэтага, правялі рамонт купелі і высадзілі кветкі...

У суседнім Дубровенскім раёне праведзена добраўпарадкаванне крыніцы ва ўрочышчы Кірэева. Адрамантавалі лаўкі, пафарбавалі малыя архітэктурныя формы. Вельмі сімвалічна, што ва ўладкаванні крыніцы прымалі ўдзел работнікі раённага выканаўчага камітэта, інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

У Полацкім раёне Гомельскім сельскім выканаўчым камітэтам праведзены работы па ўладкаванні гідралагічнага помніка прыроды «Гомельская крыніца». Адрамантавалі альтанку і ўсталявалі яшчэ адну, абсталявалі кантэйнерную пляцоўку для збору ЦКА, правялі добраўпарадкаванне тэрыторыі крыніцы.

У Сянно арганізавалі экалагічную акцыю па навядзенні парадку на тэрыторыі помнікаў прыроды крыніц «Пясчанка» і «Каплічка». У ёй удзельнічалі выхаванцы ваенна-патрыятычнага клуба «Спарта».

У Шаркаўшчынскім раёне работнікамі Станіславаўскага сельскага савета і музея імя Сікоры праведзены работы па ўладкаванні крыніцы ў раёне возера Алашскае. Там ачысцілі крыніцу, добраўпарадкавалі тэрыторыю, падыход да крыніцы зрабілі з дашчанага насцілу. А работнікі Лужкоўскага сельсавета з землякамі добраўпарадкавалі крыніцу ў вёсцы Барсукі. Яны ачысцілі вадазбор, добраўпарадкавалі тэрыторыю вакол яго, устанавілі навес і зрабілі новы масток.



Крыніца ў Глыбоцкім раёне.

У Чашніцкім раёне таксама добраўпарадкавалі тэрыторыю вакол лясной крыніцы «Езус». Там уладкавалі аўтастаянку, устанавілі альтанку для адпачынку і кантэйнерную пляцоўку для збору адходаў. Акрамя таго, з'явіцся аншлаг. Работы ініцыявала Чашніцкая раённая інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, якая правяла іх разам з мясцовым лясніцтвам, актывістамі «БРСМ», навучэнцамі сярэдняй школы № 4 і грамадскімі эколагамі.

У Глыбоцкім раёне добраўпарадкавалі крыніцу на трасе Глыбокае — Полацк у раёне вёскі Пліса. Тут усталявалі інфармацыйны аншлаг і малыя архітэктурныя формы. Дадатковa праводзяцца работы па добраўпарадкаванні крыніцы каля вёсцы Альховікі. У гэтым месцы падсыпалі пад'язныя шляхі, расчысцілі прылеглую тэрыторыю, паставілі альтанку...

І аналагічных прыкладаў нямала.

Дарэчы, усё больш людзей прыязджаюць па чыстую ваду з бліжняга замежжа, напрыклад расіяне і прыбалты любяць адпачыць каля крыніц, набраць з сабой вады.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота з асабістага архіва.**

# ВЯРНУЛІСЯ ДА РОДНЫХ ХАТ

## Як землякі ўвекавечылі памяць франтавікоў з роднай вёскі Зарэчча

**З Міхаілам Куцам і Георгіем Шведам стаім каля першай мемарыяльнай дошкі на памятнай алеі. На ёй партрэт Мікалая Гука і гады жыцця яго: 1926—1945. Пазначана, што салдат загінуў у студзені 1945-га. Цалкам верагодна, што да 19-годдзя свайго хлопец не дажыў. Разважаем, што прызыву падлягалі з 18 гадоў. Па сутнасці дзеці ішлі на вайну, такія юныя, нявопытныя. Часта яны гінулі першымі, многім не суджана было вярнуцца. А гэта — ненароджаныя іх дзеці, адзінокія равесніцы, несуцешныя маці. Такая яна, вайна. Яе можна адчуць па гісторыі адной асобна ўзятай вёскі амаль праз 80 гадоў...**

### Стэнд, які ўпаў

Партрэт Мікалая паставілі першым нездарма, ён стаіць цяпер акурат насупраць сваёй хаты, адкуль Колю і праводзілі родныя на вайну. Нават палоска зямлі, на якой цяпер размешчаны ўвесь мемарыял, некалі іх сям'і належала. Глядзіць Коля на вясковую вуліцу. Ці не самы малады ён з 27 аднавяскоўцаў, якія не вярнуліся з фронту ў Зарэчча. А 32 чалавекі вярнуліся. Усяго з невялікай вёскі на Пружаншчыне ў вайне ўдзельнічала 59 мужчын.

Пасля вайны абсалютная большасць жыхароў працавалі ў калгасе, гадавалі дзяцей. Да памяці загінулых франтавікоў і пашаны жывых удзельнікаў вайны тут заўсёды ставіліся ўважліва. У свой час калгасны парторг сабраў па хатах фотаздымкі франтавікоў, вырабіў стэнд пад назвай «Вечная слава героям, якія загінулі за свабоду і незалежнасць Радзімы». Стэнд вісеў на пачэсным месцы ў «чырвоным кутку» калгаснага двара, дзе збіраліся найбольш па святочных нагодах.

Але слава аказалася не вечнай, бо мяняліся пакаленні і ўклад жыцця. Калгасны двор прыйшоў у занялад, фермы закрывалі, пабудовы знослі. І вось выхадзец з гэтай вёскі Георгій Швед аднойчы выпадкова зазірнуў у былы «чырвоны куток» дзе жахнуўся: стэнд валяўся на падлозе. Яго ідаць, знялі, паставілі да сцяны, потым шчыт нахіліўся ці хто зачапіў. Георгій Яраслававіч забраў тыя здымкі дадому. Ён і раней збіраў памятныя фатаграфіі землякоў, а таксама сам здымае, таму архіў меў неблагі. Стаў крыху прыводзіць у сістэму, пацішу ў бацькоўскім доме ўсталёўваць нешта накшталт музея. І ўвесь час разважаў, як жа лепш увекавечыць памяць землякоў. Аднойчы падзяліўся гэтымі думкамі з аднавяскоўцам Міхаілам Куцам.

### Ідэя, што пранікае ў душу

— Мне тады твая ідэя ў душу запала, — кажа Міхаіл Міхайлавіч. — І я стаў думаць, што ж такое зрабіць, каб не знікла памяць пра родную вёску, яе жыхароў.

У цяперашняга брэсцкага прадпрымальніка Міхаіла Куца бацька таксама ваяваў, але, на шчасце, вярнуўся. І бацька яго жонкі франтавік. Так што для сям'і гэтая тэма заўсёды была асаблівая. А калі на Дзень вёскі ў 2015 годзе Георгій Швед у цэнтры сяла выставіў шчыт са здымкамі, якія ён захаваў, адрэстаўраваў, то людзі сталі падыходзіць да яго, угледацца. Пазнавалі родных, плакалі, клікалі ўнукаў, паказвалі партрэты. Вось тады і Куца нібы ахінула, у галаве карцінка ўзнікла з будучым мемарыялам. Сталі раіцца з іншымі землякамі, абгаварылі магчымы ўдзел кожнага.

Вядома, ільвіную долю расходаў узяў на сябе прадпрымальнік. Былі выраблены мемарыяльныя дошкі з фотапартрэтамі загінулых землякоў. Іх выстраілі ў выглядзе алеі, у канцы якой устанавілі памятны знак-арку са звонам. Чыіх здымкаў не знайшлі, напісалі прозвішчы на асобнай дошцы.

### Землякі з розных краін

На адкрыццё мемарыяла ў верасні мінулага года з'ехаліся некалькі сотні выхадцаў з Зарэчча. Такой колькасці людзей вёска не бачыла даўно. Былі госці не толькі з розных гарадоў Беларусі, але і з замежжа. Дачка франтавіка Івана Гука Вольга Ішчанка



Радня каля партрэта франтавіка.

прыехала з Адэсы. У «пахаванцы», якую атрымала яе маці ў канцы зімы 45-га, гаварылася, што Іван Васілевіч Гук загінуў смерцю храбрых 13 лютага і пахаваны ва Усходняй Прусіі. А Волечцы быў толькі год, калі бацька пайшоў на фронт, і пра бацьку яна ведала толькі з аповедаў блізкіх людзей. «Пакуль жывая, буду прыязджаць сюды», — сказала тады дачка Івана Гука.

Пра свайго бацьку Івана Шчэрбу, артылерыста, кавалера ордэна Славы 3-й ступені, гаварыла дачка Марыя Манюк. Сям'і нават не ўдалося адшукаць яго магілу, бо артылерыст памёр ад цяжкіх ран у франтавым шпіталі, пахаваны недзе ў Аўстрыі. На адкрыцці Марыя Іванаўна казала пра гора сваёй маці і іншых салдацкіх удоў, якія выплакалі вочы і заўчасна пастарэлі. Цяпер у іх нашчадкаў ёсць яшчэ адна нагода прыехаць у вёску, зайсці на магілкі, пастаяць каля партрэтаў бацькоў. Бо Дзень вёскі Зарэчча будзе ладзіцца кожны год, — запэўніла **старшыня Велікасельскага сельскага Савета Таццяна НАВІЦКАЯ.**

### Самая маладая жыхарка

А ў вёсцы застаецца зусім жменька людзей. Калі год таму мемарыял адкрывалі, было яшчэ пад два дзясяткі чалавек. Цяпер — амаль удвая менш. Таісія Аляксандраўна Субота сказала, што яна самая маладая жыхарка Зарэчча, а ёй ужо 78 гадоў. Таісія Аляксандраўна вельмі рада, што ў іх з'явілася такое цудоўнае памятнае месца: «Хварэю зараз. На мінулым тыдні ў доктара была, назад ехаць з горада таксі брала. Дык гэтаму хлопцу-кіроўцу сказала, каб далей праехаў, развярнуўся насупраць нашай галоўнай алеі, каб і ён убачыў. Ён так і зрабіў».

Вось Міхаіл Куц лічыць, што нехта абавязкова пройдзе-праедзе, нехта кветку на 9 Мая пакладзе, іншы маршрут скарэктуе, каб спецыяльна заехаць ды дзецям паказаць.

— Ну а пасля нас, спадзяюся, нехта падхопіць эстафету, не дасць загінуць гэтаму мемарыялу. Памяць павінна заставацца. Хто ж мы такія без памяці пра карані, пра вёску, з якой выйшлі, пра землякоў? — разважае Міхаіл Міхайлавіч.

### Каб падхапілі эстафету

Энергічныя выхадцы з Зарэчча вырашылі не спыняцца на дасягнутым і развіваць мемарыял. Цяпер узводзіцца капліца. Яе купал, унутранае начынне рыхтуюцца ў Брэсце, сюды неўзабаве будуць прывезеныя гатовыя кампаненты і зманціраваны.

«А з часам, калі ўсё будзе добра, вунь там, — паказвае рукой Міхаіл Міхайлавіч, — абсталюем стаянку для машын. Там жа разаб'ём сквер з дрэвамі, паставім некалькі сталоў з лаўкамі, каб на Дзень вёскі можна было прысесці, пагутарыць, успомніць землякоў, якіх ужо няма, і парадавацца сустрэчы іх нашчадкаў. Вёскі хутка не будзе як населенага пункта, але мы павінны захаваць яе для сябе, нашых дзяцей, унукаў».

І праўда, Зарэчча пераўтварылася з узвядзеннем мемарыялу. Раней на яго месцы, у самым цэнтры сяла была пустка, яна паступова зарастала травой, кустоўем. Перад устаноўкай мемарыяльных дошак было праведзена добраўпарадкаванне, пракладзены дарожкі, пасаджаны туі. Газон цяпер даглядаецца. Прывезены і каменьвалун, які нагадвае, што Зарэчча вядомае з XVIII стагоддзя.

— Дзіўная справа: чым больш жывеш і больш аддаляешся ад родных мясцін, тым болей сюды цягне, — разважае Міхаіл Куц. — Некалі вялікая вёска была. Статак кароў налічваў 80 галоў. Былі дзве фермы галоў на 600 у суме. А мая маці даіла кароў, калі на ферме не было ніякай механізацыі. 16 кароў тры разы на дзень трэба было выдаіць уручную. Вядома, даводзілася дапамагаць. Цяжкая работа тады была ў сельскай гаспадарцы. Нядзіўна, што мы імкнуліся хутчэй паехаць з вёскі. Я пасля заканчэння школы паступіў у ваеннае вучылішча, служыў у розных месцах Саюза. Потым асеў у Брэсце. І бацькоў няма з 80-х гадоў. А сюды ўсё роўна цягне, прыязджаць хочацца. Тут прайшло дзяцінства. Тут раней, да меліярацыі, балот больш было, а прыгажосць якая, а птушыныя песні вясной! Нездарма ж зараз актыўна загаварылі пра малую радзіму. Цяпер разумееш, што яна ў нас захавала нешта такое, чаго на ўсё жыццё хапае.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*Пружанскі раён.*

# «СЯМЕЙНЫЯ» ДРЭВЫ ДЛЯ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

## На Гродзеншчыне вядзецца закладка алей у гонар важных сямейных падзей

**Гэта можа быць шлюб альбо нараджэнне дзіцяці. Пасадкай дрэва можна адзначаць і іншыя прыемныя падзеі ў сямейным жыцці. На ініцыятыву БРСМ адгукнуліся многія раёны Гродзенскай вобласці. Вясновая пасадка папоўніла гарадскія паркі на 200 дрэў, восенню «зялёная» акцыя будзе працягнута.**



### Замест пустак — зялёны ландшафт

Сапраўды, рух па стварэнні сямейных алей захапіў Гродзенскі рэгіён. Ініцыятыву ўдала пачалі ў Смаргонскім раёне. Тут маладыя сем'і вясной высадзілі ліпы, якія ім далі ў жыллёва-рамонтнай службе. На пасадку выйшлі многія маладыя сем'і, у тым ліку з дзецьмі.

Адметна, што ліпавая алея з'явілася ў новым, самым маладым мікрараёне Усходні. Пакуль тут многа пустак, але ў маладых жыхароў ёсць намер ператварыць іх у зялёныя зоны. Дарэчы, кожнае дрэва сямейнага парка — імянное, на ім умацавана спецыяльная бірка з прозвішчам сямейнай пары. У сваю чаргу, сужэнцы атрымалі памятны сертыфікат. Менавіта яны будуць назіраць за ростам дрэва, даглядаць яго. Першы вопыт па стварэнні парка сямейных дрэў будзе працягнуты, запэўнілі ў Смаргонскім райкаме БРСМ. Маладыя сем'і падтрымалі азеляненне горада і гатовы далей рабіць свой унёсак у гэтую справу.

У Астраўцы тэрыторыю па вуліцы Валадарскага ўпрыгожыла кляновая алея з 15 саджанцаў. Пакуль дрэвы яшчэ маладыя, як і сем'і, што іх пасадзілі. Але праз некалькі гадоў яны зменяць ландшафт пусткі і будуць радаваць жыхароў мікрараёна сваім зялёным уборам і ціністай прахалодай. Ініцыятыву маладзёжнай арганізацыі падтрымалі 15 сем'яў, многія з якіх прыйшлі на закладку алеі з малымі дзецьмі. Для іх гэта — добры прыклад упрыгожвання сваёй малой радзімы.

### Каб саюз быў моцны

А вось у Лідзе адмысловую алею стварылі непасрэдна сямейныя пары ў дзень заключэння шлюбу. І што прыкметна, рэгістрацыя праходзіла ў самім гарадскім парку «Горні». Пасля ўрачыстай цырымоніі сужэнцы, у тым ліку нявесты ў белых шлюбных сукенках, узялі ў рукі лапаты і замацавалі свой саюз пасадкай дрэў.

Пакуль на ліпавай алеі пяць дрэў, але гэта толькі пачатак. Бо ў парку яшчэ нямала месца для новых саджанцаў. Традыцыя пасадкі маладымі парамі будзе працягвацца, найбліжэйшая пасадка адбудзецца ўжо хутка — у першыя дні восені.

### Будучыня за кедрамі?

У Зэльве з'явілася незвычайная алея — кедравая. У пасадцы 20 дрэў удзельнічалі не толькі сямейныя пары, але і заканаханыя, што плануюць у хуткім часе ажаніцца. А выбар кедра, як аказалася, невыпадковы. Гэта магутнае дрэва, да таго ж яшчэ і прыгожае. А ўстаноўленая каля кожнага таблічка абавязвае «аўтараў» дрэў клапаціцца пра іх, бо яны яшчэ вельмі малыя. Разам з тым кедр мае ўсе падставы прыжыцца, бо ён хоць і адносіцца да хвойных, але распаўсюджаны ў паўднёвым і ўсходнім клімаце. Магчыма, з лёгкай рукі сужэнцаў у Зэльве з'явіцца не проста алея, а сапраўдны кедравы парк, які будзе спрыяць адаптацыі гэтага дрэва ў беларускіх шыротах.

Дарэчы, пра зэльвенцаў хочацца расказаць больш падрабязна. Бо гэта далёка не адзіная пасадка ў гонар малой радзімы. Каб зрабіць свой горад прыгожым, яго жыхары сёлета высадзілі ажно 700 саджанцаў. Узялі ў рукі рыдлёўкі і вядомыя жанчыны раёна, якія стварылі каля аўтавакзала сваю алею знакамітых жанчын. Сёння імі пасаджана 25 клёнаў, частка з якіх прысвечана знакамітым землякам, якія нарадзіліся на Зэльвеншчыне. А на беразе вадасховішча з'явілася алея здароўя з елачак і бяроз. Найлепшыя рабочыя дынастыі высадзілі сваю алею ўздоўж дарогі па вуліцы Булака. Вуліца названа ў гонар камандзіра партызанскага атрада «Перамога» Паўла Булака. Сёлета вуліцу значна азелянілі — тут высаджана каля сотні маладых клёнаў.

### Пасадка з эмоцыямі

Не засталіся ўбаку ад «зялёнай» кампаніі і жыхары абласнога цэнтра. У скверы каля загса 50 сем'яў заклалі сімвалічную алею. Да добрай справы далучаюцца іншыя маладыя сем'і. Напрыклад, пры нараджэнні дзіцяці ёсць магчымасць папоўніць флору сквера і пасадзіць дрэва ў гонар новага гродзенца.

Дарэчы, свой мікрараён азелянілі і маладыя ашмянцы. У рамках Года малой радзімы яны высадзілі свае сямейныя дрэвы — рабіны, клёны, ліпы. Алея будзе добрым напамінам сем'ям аб важных падзеях у іх жыцці, да таго ж Ашмяны пазбавяцца пустак і будуць выглядаць больш утульна.

Усплёск эмоцый выклікала акцыя па пасадцы дрэў у горадзе-спадарожніку Скідзелі. Парк сямейных дрэў стаў самым буйным зялёным аб'ектам у паркавым комплексе «Алея Славы». І з'явіўся ён дзякуючы сем'ям скідзельчан, якія высадзілі больш за сотню дрэў — ліп, каштанаў і клёнаў. Цяпер гэта, можна сказаць, сямейная рэліквія, фамільная каштоўнасць, якую можна перадаваць з пакалення ў пакаленне, бо кожнае дрэва — імяннае і мае таблічку. У пасадцы ўдзельнічалі і шматдзетныя сем'і. Саджанцы даў Скідзельскі лясгас, які займаецца не толькі ўзнаўленнем лясоў, але і азеляненнем горада. Спецыялісты правялі майстар-клас перад пачаткам масавай пасадкі.

Трэба сказаць, што гараджане актыўна дзякавалі энтузіястам гэтай справы ў сацыяльных сетках. Многія выказалі жаданне ўдзельнічаць у кампаніі па азеляненні горада і надалей. І такая магчымасць, верагодна, прадставіцца ўжо восенню.

### Плюс дрэвы ў кадушках

На верасень—лістапад запланавана пасадка алей у Дзятлаўскім і Воранаўскім раёнах. А ўсяго да Года малой радзімы ў вобласці з'явілася сем новых паркавых алей, дзе высаджана некалькі сотняў маладых дрэўцаў.

— Акцыя выклікала жывы інтарэс у маладзёжным асяроддзі, — расказаў **першы сакратар Гродзенскага абкама БРСМ Павел МІХАЛЮК.** — Асабліва захапіла тое, што дрэвы — імянныя. Але гэта і абавязвае, бо іх трэба даглядаць. Таксама многія сем'і выказалі жаданне высаджваць дрэвы ў гонар важных падзей у жыцці сям'і, напрыклад нараджэння дзіцяці. І мы гатовы дапамагчы з пасадачным матэрыялам.

У абласным цэнтры зялёныя зоны з'явіліся ў многіх гарадскіх мікраёнах. Як расказалі на прадпрыемстве «Гродназеленбуд», сёлета ў Гродне высаджана больш за дзве тысячы дрэў і дэкаратыўных кустоў. Асаблівая ўвага надаецца пешым зонам, месцам каля транспартных магістраляў, новым мікрараёнам. Сёлета ў Гродне з'явіліся два новыя скверы ў цэнтры горада, адзін з іх упрыгожыў Швейцарскую даліну, дзе любяць гуляць сем'і з дзецьмі. Новым кірункам у азеляненні гарадскога асяроддзя сталі дрэвы ў кадушках. Сёлета на цэнтральнай плошчы такім чынам устаноўлена дзесяць клёнаў глабазум. Па меры росту ім будзе надавацца шаравідная форма. За два гады на плошчах, дзе няма зеляніны, мяркуецца ўстанавіць каля 40 мабільных дрэў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

### Неабходны каментарый

**Дзмітрый СТАНКЕВІЧ, дырэктар ЖРЭС Смаргонскага раёна, дэпутат Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Вельмі правільна, што кіраўнік дзяржавы звяртае ўвагу на азеляненне населеных пунктаў. У прыватнасці, Прэзідэнт адзначыў, што абласны цэнтр патрабуе больш пільнай увагі да гэтай праблемы. Гарады прырастаюць новымі мікрараёнамі, і іх трэба азеляняць. Таму праект па стварэнні паркавых алей, які ініцыяваў БРСМ да Года малой радзімы, надзвычай актуальны. Мы таксама ў Смаргоні значна актывізавалі гэту работу. На пасадкі выходзяць не толькі нашы работнікі, але і школьнікі, жыхары горада. Праўда, хацелася б, каб гараджане былі больш актыўныя ў жаданні азеляніць свой горад.

У сувязі з гэтым згадваецца вопыт некаторых еўрапейскіх краін. Напрыклад, у сталіцы Аўстрыі Вене кожнае дрэва і куст маюць свой інвентарны нумар. І калі там спілваюць адно дрэва, замест яго садзяць пяць. Такое правіла наша арганізацыя таксама пераймае, замест аварыйных дрэў высаджваем некалькі новых на адпаведных плошчах. Сёлета прадпрыемства выходзіць з такой ініцыятывай: высадзіць у мікрараёнах піхтавыя елкі, якія заменяць прывязныя навагоднія. Такі вопыт можна пашырыць на ўсю вобласць. Восенню мы плануем высадзіць некалькі елачак, якія праз колькі гадоў будуць сапраўднымі навагоднімі прыгажунямі.


**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении аукциона**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению РУСП «Минское племпредприятие» (продавец), проводит открытый аукцион по продаже:

**Лот № 1 (повторный аукцион): автомобиль МАЗ-543205-226 (количество осей – 2, привод – задний, полная масса 18 000 кг, масса без нагрузки – 7 500 кг, идентификационный номер VIN № Y3M54320570002380, количество пассажирских мест – 1, автомобиль укомплектован дизельным двигателем с рабочим объемом 14,86 дм³, мощностью 330 л. с., пробег (по одометру) – 383399 км, пробег (по документам) – 383399 км, регистрационный номер – АВ 5618-5, год выпуска – 2007, цвет – белый, страна производства – Республика Беларусь).**

Начальная цена с НДС(20 %) – **4 136,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены **– 413,60 бел. руб.** *(Стоимость снижена на 20 %)*

**Лот № 2: автомобиль ПАЗ 3205 А1(количество осей – 2, привод – задний, полная масса – 7 705 кг, масса без нагрузки – 4720 кг, идентификационный номер VIN № X1M3205A140004284, количество пассажирских мест – 25, автобус укомплектован бензиновым двигателем с рабочим объемом 4,25 дм³ мощностью 120 л. с., пробег (по одометру) – 378736, пробег (по документам) – 378736 км, регистрационный номер АА0710-5, год выпуска – 2004, цвет – бело-синий, страна производства – Российская Федерация.**

Начальная цена с НДС (20 %) **– 6648,00 бел. руб.** Задаток 10 % от начальной цены – **664,80 бел. руб.**

**Лоты находятся по адресу: Несвижский район, д. Фольварковцы.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000в ЦБУ № 701ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **09.09.2019** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.09.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17. Контактный тел.: для осмотра транспорта 8 (029) 686 21 30**



**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 19.09.2019 г. повторного открытого аукциона**

Лот № 1: **Капитальное строение с инв. № 730/С-12526 – здание административно-хозяйственное**, площадью 82,8 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская область, Кричевский р-н, г. Кричев, ул. К. Маркса, 13. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 724050100002000491, площадь С 0,0528 га.
Начальная цена продажи: 5 596,62 доллара США без учета НДС Сумма задатка: 559,62 доллара США.
Валюта платежа: белорусский рубль с применением курса Национального банка Республики Беларусь на дату внесения платежа. Установленная в ходе аукциона цена продажи Объекта будет увеличена на сумму налога на добавленную стоимость (НДС 20 %) согласно законодательству Республики Беларусь.

**Аукцион состоится 19 сентября 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Прием заявлений (только личная подача) и внесения задатка: по 18.09.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** туристско-экскурсионное дочернее унитарное предприятие «Туристско-гостиничный комплекс «Могилевтурист», УНП 790758001, г. Могилев, пр-т Пушкинский, 6

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 10 календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номере газеты «Звязда» от 08.08.2018, 15.12.2018, 16.03.19

Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222-72-41-14, +375 29 624-26-25, на сайте ino.by



УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 04.09.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Акулича С. А. Легковой хэтчбек «Фиат Пунто», 2000 г. в., начальной стоимостью 1 120 рублей, легковой седан «Форд Мондео», 2008 г. в., начальной стоимостью 5 680 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8(029)7790809.

УНП 100706519

# КАРОВА Ў ДВАРЫ — ПРЫБЫТАК У СЯМ'І

## Аднак колькасць свойскай жывёлы ў прыватных гаспадарках змяншаецца

**Не так даўно на прыём да старшыні Мінаблвыканкама Анатоля Ісачанкі, які ён праводзіў у Мядзеле, запісалася жанчына накont арганізацыі збору малака. Папярэдне да яе выехалі спецыялісты, каб разабрацца ў сітуацыі. Жанчыну чакалі на прыёме, але яна не з'явілася.**

Сутнасць пытання растлумачыў **начальнік Нарачанскага вытворчага ўчастка адкрытага акцыянернага таварыства «Маладзечанскі малочны камбінат» Сяргей КРУГЛІК:**

—У грамадзянкі ўзнік канфлікт з індывідуальным прадпрымальнікам, які збіраў малако ў насельніцтва і адмовіўся яго прымаць у гэтай жанчыны. Справа ў тым, што прадукцыя не адпавядала ні санітарным, ні ветэрынарным нормам, ні фізічным параметрам, ні чысціні, ні тэмпературы. І ён меў рацыю. Але ў адказ гаспадыня адрэагавала эмацыянальна і запатрабавала, каб малако забіраў малочны камбінат. Мы стварылі камісію і выехалі на месца, прыхапіўшы з сабой асобныя бітон. Замералі тэмпературу малака — паказала 17,4 градуса па Цэльсію, пры дапушчальнай да 10 градусаў. Малако было забруджана фізічнымі часцінкамі.

> За літр малака дзяржава плаціць 48 капеек. Калі чалавек штодня, напрыклад, здае па 20 літраў, то нескладана падлічыць, што за месяц можа атрымаць каля трохсот рублёў, за тры «малочныя» месяцы — каля 900 рублёў.

Мы папрасілі працадзіць яго ў нашай прысутнасці. Спадарыня не знайшла для гэтага нічога лепшага за брудную кашулю. Паколькі па астатніх параметрах малако падыходзіла, пайшлі ва ўступкі, вылілі яго ў асобную ёмістасць і прывезлі на прадпрыемства, дзе дадаткова прафільтравалі, ахаладзілі і пусцілі ў перапрацоўку.

На наступны дзень замеры паказалі, што тэмпература малака 18,4 градуса, яно зноў бруднае. Камісія не ўзяла з сабой асобнай тары, бо думала, што гаспадыня адрэагавала на заўвагі і выправіць усе недахопы. Вядома, такую прадукцыю не мог забраць і малакавоз, каб не сапсаваць тое, што знаходзілася ў бочцы. Мы склалі акт, які падпісалі ўсе члены камісіі і ўладальніца кароў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Трэці раз тэмпература малака была ўжо 24 градусы, яго шчыльнасць і колькасць саматычных клетак значна перавышалі норму. Натуральна, малако мы не прынялі і растлумачылі здатчыцы, што камісія не можа кожны дзень выязджаць на месца па яе патрабаванні — гэта аднімае не толькі шмат часу, але і фінансаў. Гаспадыня сказала, што не пакіне проста так справу і будзе скардзіцца ў вышэйшыя інстанцыі. У яе тры каровы, дзве з якіх патрабуюць належнага догляду. Вынікі актаў, фотаздымкі мы перадалі ў райвыканкам і звярнуліся ў санітарную службу раёна, каб дапамаглі навесці парадак у гэтым пытанні, — канстатаваў Сяргей Яўгенавіч.

— Усяго ў нашым раёне ў асабістых падсобных гаспадарках налічваецца 422 каровы. На першае студзеня 2018-га іх было 500. За год мінус склаў 78 галоў, — уступае ў размову **старшыня Мядзельскага раённага Савета дэпутатаў Алег БАРОЎКА.** — Летась з асабістых падворкаў грамадзян закуплена 1045 тон малака. За май, які лічыцца месяцам вялікага малака, гэты паказчык — на ўзроўні 86 тон. У нас складзены маршруты збору малака ў насельніцтва. Спецмашыны не абмінаюць ні адзін населены пункт, нават тыя, дзе трымаюць усяго адну рагулю.

Як адзначыў Алег Алегавіч, калі-нікалі ўзнікаюць і спрэчныя моманты з прыёмкай малака. Галоўны — наяўнасць антыбіётыкаў. Гэта і зразумела: жывёла часам хварэе, і яе даводзіцца «калоць».

«Мы, вядома, бракуем гэтую партыю, уводзім каранцін, праводзім з людзьмі прафілактычныя гутаркі. Малако з прыватных гаспадарак збіраецца круглы год. Зімой прасцей, у летнюю спякоту яго трэба хутчэй прыняць і даставіць на перапрацоўку — да якасці малака прад'яўляюцца жорсткія патрабаванні. Мы стараемся давесці людзям, што ў сельвыканкамаў адна з імі мэта — харчовая бяспека прадуктаў. І калі адзін нядобрасумленны здатчык бухне бітон некандыцыйнага малака ў агульнае, то падвядзе і суседа, і жыхароў раёна, што трымаюць жывёлу.

У прыватных асоб, якія зарэгістраваны індывідуальнымі прадпрымальнікамі і нанятыя філіялам Маладзечанскага камбіната на работу, таксама ёсць зацікаўленасць сабраць як мага больш малака адпаведнай якасці і своечасова даставіць на завод. Ад гэтага залежыць іх заробкі, надбаўкі. У той жа час шмат затрат цягне асабісты транспарт, які трэба абслугоўваць, рамантаваць.

> Калі-нікалі ўзнікаюць і спрэчныя моманты з прыёмкай малака. Галоўны — наяўнасць антыбіётыкаў. Гэта і зразумела: жывёла часам хварэе, і яе даводзіцца «калоць».

Калі раней сельсаветы займаліся пытаннямі забеспячэння жыхароў кармамі для свойскай жывёлы, пашамі, то цяпер іх роля памянялася. Яны выконваюць, так бы мовіць, ролю трацейскага суддзі пры спрэчных момантах. Ну і вядома, заахвочваюць уласнікаў прыватных падворкаў трымаць больш жывёлы. «Кожны год лепшыя малаказдатчыкі на раённым злёце перадавікоў узнагароджваюцца грашовымі прэміямі. У мясцовых сродках масавай інфармацыі расказваем пра іх, прапагандуем вопыт тых, хто найбольш здаў і сабраў ад насельніцтва малака. А таксама паказваем іх праблемы і як яны вырашаюцца», — кажа Алег Алегавіч.

Догляд за хатняй жывёлай паўсюдна лічыцца цяжкай працай. Апраўдваецца яна матэрыяльна або не, кожны лічыць па-свойму. У прыватнасці, за літр малака дзяржава плаціць 48 капеек. Калі чалавек штодня, напрыклад, здае па 20 літраў, то нескладана падлічыць, што за месяц можа атрымаць каля трохсот рублёў, за тры «малочныя» месяцы — каля 900 рублёў. Для кагосьці гэта значная прыбаўка да сямейнага бюджэту. На думку іншых, такія даходы не апраўдваюць фізічных намаганняў і клопатаў. Лепш купіць малочныя прадукты ў краме.

Дадам, што доля паступлення малака ў філіял Маладзечанскага камбіната ад насельніцтва складае 8 % ад агульнай колькасці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


**ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 12 сентября 2019 года проводит 16-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 201 | Специальный автомобиль ГАЗ-66 с кузовом-фургоном ДФ-3 в составе: кузов-фургон ДФ-3, № 4892, 1988 г., *4 кат.* Автошасси ГАЗ-66 ш. 0316490, дв. 879283, 1988 г., *4 кат., 5 380 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 3 500,00 | 700,00 |
| 202 | Специальный автомобиль Урал-375 с кузовом-фургоном К1-375 в составе: кузов-фургон К1-375, № 12140, 1980 г., *4 кат.* Автошасси Урал-375, ш. 317182, дв. 072279, 1980 г., *4 кат., 5 053 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 6 500,00 | 1 300,00 |
| 203 | Специальный автомобиль Урал-43203-1012 с кузовом-фургоном КБ1-4320 в составе: кузов-фургон КБ1-4320 № 11485 1987 г. *2 кат.* Автошасси Урал-43203-1012, ш. 082388, дв.138829, 1987 г., *3 кат., 22 704 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 9 200,00 | 1 840,00 |
| 204 | Специальный автомобиль КамАЗ-43106 с кузовом-фургоном К1-375 в составе: кузов-фургон К1-375, № 08186, 1990 г., *4 кат.* Автошасси КамАЗ-43106, ш. 0004407, дв. 0637184 1990 г., *4 кат., 57 817 км* | г. Гомель, в/ч 01313-Г | 9 200,00 | 1 840,00 |
| 205 | Гусеничное шасси МТ-Лбу, ш.108312047, дв. 978740, 1984 г., *4 кат., 2 874 км* | н. п. Станьково, в/ч 25819 | 75 000,00 | 15 000,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, **12 сентября 2019 г. в 10.30.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы до **15.00 9 сентября 2019 года**.

Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться **12 сентября 2019 г. с 9.00 до 9.45.**

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5** банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10** банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: белорусские рубли – р/с BY51BPSB30121078830299330000, российские рубли – р/с BY05BPSB30121078830876430000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-СберБанк», г. Минск, ул. Чкалова, 18, корп. 1, код BPSBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662 Корреспондент-Сбербанк России г. Москва, № коррсчета 30111810100000000090. Реквизиты банка: БИК 044525225, ИНН 7707083893, к/с в ОПЕРУ Московского ГТУ Банка России № 30101810400000000225, **Без НДС**. **Справки по тел./факс: (017) 398 05 41**



Утерянные страховые полисы по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств ОСГО ВТС серии ВА9385851, ВВ6431860, ВВ0639917, ВВ3107593, ВВ9193905, квитанции о приеме наличных денежных средств формы 1-СУ СВ2309372,СВ4422240,СВ4440782, универсальный серии ПЕ0365147, ПЕ0399728, страхование от болезней и несчастных случаев во время поездки за границу серии БА1386405,БА0213917 страховой компании «Промтрансинвест» считать недействительными.

УНП 100357923



В извещении, опубликованном в газете «Звязда» от 06.08.2019 г., о проведении электронных торгов по продаже имущества Частного предприятия «Интраст» правильной считать дату торгов 23.08.2019 г., срок приема заявок и задатков – по 22.08.2019 г. Подробнее на **WWW.BELTORGI.BY.**

УНП 191113330



УП «Белконфискат» обьявляет о проведении электронных торгов 10.09.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Наркевича Н. В. Грузовой бортовой тентовый «МАН 26.410», 2001 г. в., начальной стоимостью 12 000 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел. 8 (017) 2269489, 8 (029) 779 08 09

УНП 190431606



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 8 жніўня 2019 года.**